ЖНІВЕНЬ
31
СУБОТА
№ 26 (482)
1940 год
ЦАНА 20 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

УМАЦОЎВАЦЬ ДЫСЦЫПЛІНУ ПРАЦЫ

Узорнае, няўхільнае і паслядоўнае ажыццяўленне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР—свяшчэнны абавязак кожнага партыйнага і непартыйнага большэвіка, кожнага патрыёта нашай радзімы. Большэвіцкае выпаўненне Указа ва ўсіх галінах соцыялістычнай працы ўздымае магутнасць, сілу і славу совецкай зямлі, квітнеючай краіны соцыялізма. На барацьбу за бліскучае ажыццяўленне Указа накіраваны і рашэнні Ліпеньскага пленума ЦК ВКП(б), якія ўзбройваюць і натхняюць партыйныя арганізацыі на настойнае, паўсядзённае ўмацаванне працоўнай, дзяржаўнай і партыйнай дысцыпліны.

У святле выпаўнення Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ускрываюцца шматлікія недахопы ў дзейнасці калектываў работнікаў літаратуры і мастацтваў нашай рэспублікі.

Поруч з выдатнымі прыкладамі творчай дзейнасці многіх пісьменнікаў, ёсць у пісьменніцкім асяроддзі і праявы нядобрасумленных адносін да працы, недысцыплініраванасці. Довадам гэтага могуць служыць меўшыя месца парушэнні пісьменнікамі дагавораў з выдавецтвам, тэатрамі і іншымі мастацкімі арганізацыямі, не заўсёды сур'ёзныя адносіны асобных пісьменнікаў да якасці, мастацкай вартасці, сваёй творчай прадукцыі.

Абавязак кожнага пісьменніка перад нашым шматмільённым чытачом, перад радзімай—узняць тэмпы і прадукцыйнасць, а разам і якасць сваёй творчай працы, працаваць больш аператыўна і энергічна, даючы творы, якіх патрабуе ад сваіх майстроў слова совецкі народ.

Вялікім стымулам актывізацыі творчай працы пісьменніка з'явіцца і змяненне ўзаемаадносін між пісьменнікам і выдавецтвам. Новы прынцып гэтых узаемаадносін яскрава акрэслен пастановай ЦК ВКП(б) аб рабоце Дзяржлітвыдата. Асновай дагавора аўтара з выдавецтвам павінен з'яўляцца гатовы рукапіс. Гэта ўмова, пры патрэбным уздыме якасці рэдактуры, рэальна гарантыруе хуткае папаўненне кніжнага рынка новымі мастацкапоўнацэннымі творамі.

Патрэбна пакласці канец патуранню бяздзейнасці, патуранню творчай пасіўнасці і простаму гультайству. І наадварот—актыўна, плённа працуючых літаратараў патрэбна ўсяляк заахвочваць і падтрымоўваць. У гэтым кірунку павінна перабудаваць сваю дзейнасць беларускае аддзяленне Літфонда, якое, дарэчы, мае цяпер яшчэ вялікія хібы ў сваёй гаспадарчай дзейнасці і не заўсёды сур'ёзна падыходзіць да пытанняў матэрыяльнай дапамогі пісьменнікам.

Апарат праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і яго ўстаноў павінен працаваць зладжана, чотка. І ў гэтым асновай з'яўляецца выпаўненне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР. Загрузка рабочага дня кожнага супрацоўніка дае магчымасць скараціць штаты і, разам з тым, узмацніць работу творчых секцый, кабінета маладога аўтара, праўлення ССП БССР, беларускага аддзялення Літфонда.

Нельга мірыцца і з тым, што праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР сваю дзейнасць усё больш і больш зводзіць на ўзровень якойсьці «літаратурнай канцылярыі». У выніку — сістэматычнае невыпаўненне планаў творчай, аператыўнай работы як праўленнем, так і секцыямі Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

Праўленне ССП БССР, яго творчыя секцыі павінны па-сапраўднаму узначаліць патрэбную перабудову творчай работы ўсіх членаў Саюза — пісьменнікаў, змагацца за ўздым іх творчай актыўнасці, за новыя выдатныя поспехі беларускай літаратуры.

Узоры большэвіцкай барацьбы за выпаўненне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР павінны паказаць і калектывы работнікаў тэатраў і іншых галін мастацтваў БССР. Трэба адзначыць, што ў радзе калектываў (у Тэатры оперы і балета, Тэатры музкамедыі, многіх калгасных тэатрах) мелі месца выпадкі грубага парушэння Указа — прагулы, спазненні, самавольныя ўходы з працы. Гэта сведчыць аб тым, што партыйныя, комсамольскія і профсаюзныя арганізацыі не забяспечылі яшчэ сапраўднай барацьбы за выпаўненне Указа, не стварылі патрэбнай атмасферы непрымірымасці да малейшай праявы дэзарганізацыі соцыялістычнай працы. Дырэктары прадпрыемстваў мастацтваў, у большасці, яшчэ недастаткова поўна і рашуча выкарыстоўваюць свае правы поўнаўладнага адзінаначальніка. На аснове выпаўнення Указа, у адпаведнасці з загадам Усесаюзнага Камітэта па справах мастацтваў, павінна быць перабудавана гаспадарчая і творчая дзейнасць тэатраў. Паялічыць час рэпетыцыйнай работы, забяспечыць паскораны выпуск мастацкапоўнацэнных спектакляў—абавязак кожнага тэатра ў новым наступіўшым сезоне.

Ушчыльніць штаты, упарадкаваць адміністрацыйна-гаспадарчыя выдаткі, стварыць усе патрэбныя ўмовы для плённай творчай працы калектываў, узмацніць і пашырыць сувязі з гледачом—вось асноўныя задачы перабудовы творчай і гаспадарчай работы тэатраў, задачы, якія павінны быць неадкладна і цалкам вырашаны.

Непрымірымасць да парушанняў працоўнай і дзяржаўнай дысцыпліны, рашучае выкараненне ўсялякіх праяў нядобрасумленнасці ў адносінах да соцыялістычнай працы ва ўсіх галінах дзейнасці работнікаў літаратуры, мастацтваў — самая ...ная і важнейшая задача партый... ...мсамольскіх і профсаюзных арга...

...дзень працы, самы кароткі ў све... ...лен быць і самым прадукцыйным! ... за ажыццяўленне гэтага лозунга, ...ільнае выпаўненне Указа Прэзі... Вярхоўнага Совета СССР — абавя... ...жнага літаратара, кожнага работні... ...стацтваў Совецкай Беларусі.

500-годдзе калмыцкага народнага эпаса „Джангар"

ДЖАНГАР

Урыўкі

Бой сына Джангара—Шоўшура з Шара Гюргю

Вузкаю сцежкай, што йшла невядома куды,
Рыжы памчаўся, абнюхваючы сляды.
Выбраўся ён к скрыжаванню сямі дарог,
Бумбы сыноў калісь гналі шулмусы па іх,
Ворагі гналі Джангара улусы па іх.
Столькі было іх—і вораг злічыць не мог...
Выбраў сам Рыжы звычайны сярэдні пуць,
У месяц рабіў ён звычайны трохлетні пуць,

У суткі рабіў ён — пуць трыццаці дзён,
Рэкі шырокія браў пераскокам адным,
Хутка к морам тым атрутным дамчаўся ён,
К родным улусам яго прывялі сляды.
Зразу пазнаў Аранзала Бумбы народ,
Толькі Шоўшура пазнаць не мог народ.
«У рабстве жылі мы—надзеяй адной жылі:
Джангар прыедзе, развеецца клятая цьма,
Зніме ён путы з любімай роднай зямлі,
Зніме ён в нас сорам няволі ярма,—
Шара Гюргю ненавісны зніме палон.
Толькі дарэмны надзеі, што вернецца ён.
Гэты хлапчук невялікі нойона забіў.
Хітрасцю можа ці сонным нойона забіў,
Узяў Аранзала, валодае рыжым канём.
Не, нам ніколі не бачыць радзімы сваёй».
Так гаварылі ў жалю і смутку яны,
У рабстве знямогшыя, верныя Бумбы сыны.

— «Чый вы народ?» — іх хлапец тады запытаў.
— «Слаўнага Джангра былі мы краінай раней,
Потым Шулмускі нас хан вабраў...
Звера такога не знаў свет, як Шара Гюргю»....
— «А ці далёка дарога да вежы Шара Гюргю?».

Хлопцу сказалі: «Да вежы трохмесячны пуць».
Хлопец ударыў каня і паехаў; хацеў завярнуць,—
Бачыць: над стэпам чырвоны пыл паласой
І на двухлетку, пакрытым потнай расой,
Міма яго нейкі хлопец ляціць,
Шпарка ляціць, нібы грак маладзенькі глядзіць.

Крыкнуў Шоўшур:—«Эй, спыні, брат, каня!
Я затрымаўся, зрабі-ж ты, як я.
Давай пагаворым!»
Хлапец на кані:
— «Кажы карацей, тараплюся я... Справа ў чым?
Важныя весткі вязу».
— «Вось таму і спыніў,
Друг мой, цябе з надыходам начы.
Важныя весткі паслухаць і я хачу».

Хлапец асілку сказаў з радасцю у ваччу:
— «Джангра, нойона у Бумбе сваёй,
Быў я падданым, калі красавала яна.
Вырадак—Шара Гюргю зараз правіць зямлёй.
Толькі прышла на яго вайна:
Устаді асілкі, ідуць на яго сцяной.
Ну, а калі нашы героі пачалі бой,
Значыць, яго перамогай закончаць яны.
Значыць, к нам прыдуць вольныя, светлыя дні.
Вось і рашыў я паведаміць Бумбе сваёй,
Каб ад шулмусаў адкачавала хутчэй.
Нашых абрадаваць хуткай пабедай хачу».
Захваляваўся Шоўшур: «Я ведаць хачу,
Сілы Шара Гюргю ці ўлічылі вы?»
— «Слухай: крэпасная, што з сталі, сцяна
Хонграм збудаваная вакол бумбулвы,
Зараз туды Шара Гюргю перанесена.
Каменная сцяна па-за гэтай сцяной,
Крэпасць з крэпкага дуба стаіць за ёй,
А за трыма крэпасцямі стаяць палкі,
Шчыт-ля-шчыта стаяць, як пясок марскі».
Абняў Шоўшур хлапчука і сказаў яму ён:

«Мне калісьці казаў мой Джангар-нойон:
Ёсць у яго паміж іншых вялікіх рэк—
Таволга—сорак тысяч кібітак на ёй.
Аддаю іх табе з гэтых дзён навек.
А дажывём з табой да радасных дзён,
Бумбу вярну,—не такую яшчэ ўзнагароду дам!
А цяпер ляці к паднявольным братам,
Абрадаваць весткай ты іх паспяшы,
Хай адкачуюць усе да адзінай душы!»

Хлопец памчаўся, удзячны яму.
Крыкнуў Шоўшур, нахіліўшыся тварам к каню.
«Чорныя твае капыты, Аранзал, адламлю,
Калі, як маланка, ты заўтра к паўдню
К вежы Шара Гюргю не даставіш мяне».
Рыжы сказаў: «Я—не зняслаўлю цябе,
Заўтра апоўдні я к вежы дастаўлю цябе,
Праз горы — уцёсы я ў жэмчужнай пене прайду.
Ветрам па акіяну цярпенняў прайду.
Цераз правалы зямлі я зраблю пераскок,
Войскам стотысячным буду здавацца здалёк,
Гул залатых іскрамётных маіх падкоў
Будзе гудзець, як ад сотні добрых палкоў.
Схіліцца ніцма шулмусаў цёмная раць,
Варта ёй толькі мой бег пазнаць,
Пыл пазнаць, што паднят Аранзалам-канём!
Полчышчы цэлыя мы ад сябе самнём!
Клятву героя-ж калі парушыш ты,
Крэпасці з дуба калі не разбурыш ты,
І не разбурыш з камення збіваных сцен,
І не разбурыш са сталі каваных сцен,
Як не паломіш ты трыццаці двух знамён,
Шара Гюргю не захопіш к сабе ў палон,
Як не паломіш рашотку яго юрты,—
Помні, Шоўшур, сцеражыся ты:
Не пашкадую дзіцячай я шыі тваёй!»
І памчаўся конь гартаванай стралы шпарчэй,
Яшчаркі жвавай жвавей конь памчаў тады...

Вось адкрыла ім стэп байніцы цвярдынь.
Войску падобны ляцеў Аранзал на іх.
Затрапятаў стан шулмусаў. Прынік, прыціх
Той, хто пазнаў пыл, узняты канём-скакуном.
Бачаць пыл той Джангаравы багатыры,
Хлапчанё, бачаць, згіне ля сцен без пары.

— «Савар,—прамовіў Цэджы,—скачы напралом,
Трэба спыніць бег каня ўладара Багдо,
Трэба хутчэй ратаваць хлапчука Багдо:
Згіне ён адзін ля варожых варот».
Савар памчаўся на жвавым Лыску ўпярод
І за чумбур ухапіўся. Тут крыкнуў Шоўшур:
— Клятву я даў Аранзалу, пусці чумбур,—
Савару словы быццам былі не чутны,
Хлопца з канём ён павёў, дзе трыццаць і пяць
Моцных асілкаў чакалі, і зараз яны
Ласкамі сталі яго і каня асыпаць.
Мовіў трохлетні Шоўшур:—Нам яшчэ будзе час
Вам—прыгалубіць мяне,—верце словам маім,—
Мне—перамогшы Гюргю—прытуліцца да вас.
Зараз—мы з ворагам бой завяршым!
І наляцеў Гюзан Гюмбэ, як страла,
Урэзаўся ў левую палавіну палкоў.
І наляцеў Алтан Цэджы, як страла,
Урэзаўся ў правую палавіну палкоў.
І наляцеў трохлетні Шоўшур, як страла,
Урэзаўся ў самую сярэдку палкоў,
І разбілі варожую раць...

Пераклад М. КЛІМКОВІЧА.

З дванаццатай песні

Ёсць за гарамі Бумбы краіна адна,
Пад узыходзячай зоркай ляжыць яна,
Белай гарою, вялікай гарою здаўна
З небам высокім—высокім з'еднана яна.
Глянь ў акіян,—там зямля, як у люстры відна.
Кожнаю раннію прыбой нараджае на свет—
Золата злiткі, перлы на берег нясе.
Толькі глыне акіянскай вады чалавек,
Стане бяссмертным і юным ён стане навек.
Землі прарэзала мноства шумлівых рэк,
Вечна гуляе ў вусцях каменных вада,
Смачная і не ведаючая ільда,
Летам, увосень, узіму і ўвесну імчыцца яна,
Светлая радасць, багацце народа—яна.
Рэкі, падобна вадаправоду, цякуць
І да самога ўваходу, да юрты цякуць,

Вільгацю поячы тысячы тысяч людзей.
Толькі зірнеш ты на цёмныя берагі,
Коней убачыш, вольна пасуцца ўвесь дзень,
Летам і ўзімку травою пакрыты лугі,
Вечна зялёнай, пахучай заўсёды травой.
Лёгкія ветры ўначы пралятаюць над ёй.

Там, на зямлі, не бывае ніколі тугі.
Там, на вышыні свету, між спелых садоў
Вежа высокая ўгору, на сонца глядзіць.
Вежа Багдо над светам вялікім стаіць.
Свеціцца ясна, ўсім людзям навокал відна.
Кажуць: уходзіць далёка ў аблокі яна,
Быццам карціна красуе, — задзівіцца й птах,
Фарбы змяняюцца часта ў цябе на вачах.

Пераклад Эдзі АГНЯЦВЕТ.



Да святкавання 500-годдзя народнага калмыцкага эпаса «Джангар». Калмыцкі дзяржаўны драматычны тэатр у Элісце паставіў п'есу «Бумбін-Орн» (пастаноўка мастацкага кіраўніка тэатра В. Ф. Белаярцава). На здымку (злева) сцэна з IV акта. Багатыр Хонгр (арт. Н. М. Мукебенаў) абвяшчае Зандан Зул — дачку Магна-Хана (арт. К. С. Джапава) сваёй нявестай; (справа) артыстка К. С. Джапава, ... і Зандан Зул. Фотаклішэ ТАСС.

ЛЮБІМЫЯ ГЕРОІ КАЛМЫЦКАГА НАРОДА

Манументальная гераічная паэма калмыцкага народа «Джангар», 500-годдзе якой шырока адзначаецца 6 верасня, аб'ядноўвае дванаццаць самастойных песень, звязаных агульнымі дзеючымі асобамі. Вядучая ідэя калмыцкага эпаса — усепаглынаючая сіла любві да радзімы, дзеля якой героі ідуць на бой, робяць подвігі, праяўляюць найвялікшую самаафярнасць. Благародная патрыятычная ідэя ўвасоблена ў незабыўных мастацкіх вобразах народных герояў-багатыроў.

Перад намі ўстаюць цудоўныя, глыбока паэтычныя вобразы незвычайна моцных, адважных і мужных людзей, увасабляючых лепшыя рысы народнага характара, перамагаючых ворагаў калмыцкага народа. Часамі здаецца, быццам магутныя вобразы цуда-багатыроў з'яўляюцца звышнатуральнымі, казачнымі істотамі. Героям уласцівы такія фізічныя якасці, якія далёка перавышаюць чалавечыя магчымасці. Так, галоўны багатыр Джангар надзелены такой фізічнай іспалінскай сілай і бясстрашшам, што яшчэ дзіцём перамагае чужаземных захватчыкаў, якія пакарылі яго радзіму. Сын Джангара — Шоўшур адным узмахам шаблі зносіць галовы тысячы ворагаў. Але чым глыбей вывучаеш гэты эпас, тым больш пераконваешся, што пад фантастычнай вопраткай і цяжкімі даспехамі герояў хаваюцца сапраўдныя сыны калмыцкага народа, якія своеасабліва-канцэнтрыравана выражаюць яго гераічныя рысы, выкаваныя ім у гістарычных выпрабаваннях: бясстрашша, сілу, самаадданасць, воінскую доблесць, упартасць у дасягненні мэты. Уся магутная сіла калмыцкіх багатыроў накіравана перш за ўсё на барацьбу за шчасце народа, за незалежнасць яго ад іншаземцаў.

Кожная песня «Джангара» з'яўляецца закончаным, самастойным творам, які мае свой хвалюючы сюжэт. Чаканным стылем, мужнымі эпічнымі строфамі песні калмыцкага эпаса расказваюць аб подвігах багатыроў, якія змагаюцца супроць зла, гвалту і прыгнёту.

Увасабленнем варожых народу сіл з'яўляюцца страшыдлы-мангусы, якія пажыраюць людзей. Гэтыя алегарычныя вобразы з'яўляюцца носьбітамі самых агідных рысаў: лютасці, прагнасці, каварства, вераломства, злобы. Бясспрэчна, у вобразах мангусаў паказваюцца шматлікія лютыя ворагі радзімы, іншаземныя захватчыкі. Але мангусы не могуць зламаць дух народа, не могуць перамагчы багатыроў і заняволіць іх шчаслівую краіну. Увагу чытача прыцягваюць карціны безлічы няшчасцяў і бед, якія народ церпіць ад грабежніцкіх і захватніцкіх войн. Народныя песняры выразна падкрэсліваюць сваю нянавісць да чалавечай бойні ў імя грабяжу і гвалту, свае імкненні да мірнага працоўнага жыцця, справядлівасці, і свабоды. Вельмі характэрны зварот Джангара на радзіму, якая ў часе яго адсутнасці падверглася нападу, грабяжу і гвалту мангусаў. Ні адной кібіткі не сустрэў Джангар на дарозе, усе яны былі разбураны, а жыхары забіты ці забраны ў рабства. Застаўся толькі адзін стары ў зруйнаванай, разбуранай краіне, але і ён жыў у нары. Калмыцкія народныя багатыры ніколі і ні на каго не нападаюць першымі. Яны не маюць ніякіх ваяўнічых замыслаў, свае мечы багатыры вымаюць толькі для таго, каб папярэдзіць варожы напад, абараніць радзіму. Аберагаючы родны край ад ворагаў, героі эпаса набываюць грозную сілу, яны робяцца мужнымі, адважнымі, як львы.

Найбольш цікавы вобраз багатыра Хангора. Хангор — самы адважны герой эпаса, які карыстаецца выключнай папулярнасцю і любоўю ў самых шырокіх масах. Калмыцкі народ увасобіў у вобразе Хангора свае высокія і бессмяротныя якасці — бязмежную адвагу, любоў і вернасць да радзімы, мудрасць, душэўную чыстату. Багатыр заўсёды памятае аб сваім абавязку патрыёта і ў рашучы момант гатоў аддаць жыццё за шчасце радзімы. Ніколі і нікому не дае ён пакрыўдзіць сваю радзіму. Калі на мірнае шчаслівае жыццё краіны багатыроў — Бумбу нападаюць ворагі, Хангор робіцца самым ярасным байцом. Смерць на полі бойкі ў імя шчасця народа не страшыць багатыра. Пераконаны, што яго геройская смерць будзе мець добрыя вынікі, выратуе дзяржаву, нанясе ворагу паражэнне, ён першы ўступае у няроўны і страшны бой з бязлікай колькасцю воінаў лютага хана Мангна. Узрушаныя доблесцю і гераізмам Хангора, усе багатыры кідаюцца яму на дапамогу і знішчаюць ворага-мангуса.

Не менш характэрны эпізод барацьбы Хангора з Беке Цаганам. Сільны і люты хан Хара Кіняс, наперакор волі свайго народа, падбухтораны ваеннай клікай, імкнецца пакарыць краіну Бумбу, заняволіць «моцны і багаты народ». Захватніцкая, грабежніцкая палітыка ворага ярка выражана ў кічлівай прамове пасланца Кіняса—Цагана, які з'яўляецца як-бы зборным вобразам іншаземнай ваеншчыны.

Захапляе гордая клятва калмыцкіх багатыроў, якая да сёнешняга дня не страціла сваёй вострай выразнасці і блізка нашым пачуццям. Папулярнасць клятвы гэтак-жа незвычайна, як і героі, што далі яе. Творцы эпаса адлюстравалі ў клятве з гранічнай паўнатой уяўленне народа аб адзінстве і абавязку перад радзімай, аб неўстрашымым воінстве і вернасці, аб доблесці і праўдзівасці. У любым кутку Калмыкіі можна пачуць запаведзі прысягі. Гэта клятва—адно з найманнейшых месц нацыянальнага тварэння:

Жизни свои острию копья предадим,
Мысли свои державе родной посвятим;
Да отрешимся от зависти, от похвальбы,
От затаенной вражды, от измен, от алчбы;
Груди свои обнажим и вынем сердца
И за народ отдадим нашу кровь до конца;
Верными Джангру, едиными будем вовек
И на земле будем жить, как один человек;
Да никогда богатырь не кинется вспять,
Вражью завидев неисчислимую рать...
И да пребудем бойцами правдивыми мы
И да пребудем всегда справедливыми мы...

Ярка абрысован доблесны ваеначальнік Джангар, імем якога названы эпас. Ён нязменна кіруе барацьбой багатыроў, выручае іх з цяжкага становішча, праяўляе бацькоўскія клопаты аб іх. Ён не адзін раз выказвае цуды адвагі, ваеннай прадбачлівасці, бязмежнай і вернай дружбы. Даведаўшыся аб тым, што яго саратніка, гераічнага абаронца радзімы Хангора, узялі ў палон іншаземныя захватчыкі, Джангар спяшаецца на дапамогу. Настойна і ўпарта шукае Джангар свайго баявога таварыша. Крок за крокам багатыр раскрывае падкопы ворагаў. Каб знайсці Хангора, ён спускаецца ў бездані, уступае ў бой з ворагамі, якія каварна загараджваюць яму дарогу, робіць цудоўныя подвігі. Не адступаць перад ворагамі, а змагацца і знішчаць іх—такое баявое правіла гэтага героя, адданага абавязку.

Захапляюць і хвалююць нас і жаночыя вобразы. У эпасе дадзены самыя тонкія, самыя дасканалыя вобразы жаночага харства, вобразы мудрых, рашучых і смелых жанчын Герэнзал, Зандан Зула, Ага Шаўдал і іншыя. Цікава адзначыць, што асабістае шчасце, каханне пазбаўлены ў паэме саладжавай сантыментальнасці ці тупой пачуццёвасці. Мы бачым закаханых, гатовых да суровых выпрабаванняў, натхнёных вялікай ідэяй справядлівай вайны супроць іншаземных ворагаў, пагражаўшых іх краіне нечаканымі знішчальнымі нападамі.

Вельмі цікавы пранікнёны вобраз мудрай, мэтанакіраванай і цудоўнай жанчыны Герэнзал. Герэнзал цвёрда памятае аб грамадзянскім абавязку сыноў радзімы і калі яе муж, багатыр, у рашучы момант аказваецца ў баку ад барацьбы, яна заклікае яго да вернасці агульнай мэце, натхняе яго на подвігі. Высокія маральныя пачуцці кіруюць учынкамі гераінь. Некаторыя з іх прымаюць гарачы ўдзел ва многіх небяспечных бойках багатыроў і часта аказваюць ім вялікую дапамогу.

Выдатны вобраз багатырскай дзяўчыны-воіна, якая прымае ўдзел у бітве Мінгіана з Кюрменам-Ханам магутным. Дзяўчына-калмычка дапамагае багатыру Мінгіану ў яго рукапашным баі са шматлікімі ворагамі. Дзякуючы яе гераізму, смеласці і хітрасці, каварны мангус Кюрмен быў знішчан.

У «Джангары» шмат месца аддаецца дзецям, якія з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі ўсіх падзей і жывуць, як і іх бацькі-багатыры, клопатамі аб шчасці і веліччы радзімы. Дзеці, ва ўяўленні творцоў калмыцкага эпаса, таксама павінны быць у рашучы момант здольны на геройства, на подвіг, павінны быць гатовы к сакрушальнаму адпору, калі вораг пасягне на радзіму. І слаўныя калмыцкія дзеці, гарачыя патрыёты неаднаразова выконваюць даручэнні народных правадыроў і дапамагаюць народу ў часіну цяжкіх выпрабаванняў. Юныя патрыёты праяўляюць асаблівую мужнасць, адважнасць, настойлівасць, спрытнасць і хітрасць, перамагаючы знешняга ворага-захватчыка. Апісанне перамогі трох хлапчукоў—сыноў Хангора, Джангара, Цэджы над небяспечнейшым ворагам, які пасягаў на незалежнасць роднага народа, бясспрэчна, належыць да лепшых эпізодаў сусветнага народнага эпаса.

У эпасе шмат цудоўных апісанняў быту і адпачынку калмыцкага дзіцяці, яго гульняў і весялосці. Мы бачым, як з малых год на паляванні, у гульнях і вайсковых практыкаваннях складаецца характар будучага героя, выхоўваецца непахіснасць духа, бясстрашнасць, мужнасць і сіла. Благародны і смелы хлопчык Шоўшур, сын Джангара, паспяхова палюе на звяроў у далёкім лесе, каб «накарміць бацьку і мілую маці». Ён чулы да гора жыхароў сваёй краіны. З вялікай паэтычнай сілай паказана прамата і непасрэднасць яго характара, адважнасць і хітрасць, глыбокае разуменне ім свайго ратнага абавязку. У часе бітвы з самым злым ворагам іншаземцам Гюргю Шоўшур праяўляе цуды адважнасці. Усе багатыры захоплены патрыятычным гераізмам Шоўшура і ўслед за ім кідаюцца ў бой.

Нам, грамадзянам магутнай радзімы, асабліва блізкі і зразумелы цудоўныя пачуцці, якія натхняюць любімых герояў, старажытных багатыроў калмыцкага народа. Іменна таму «Джангар» знаходзіць асабліва магутны водгук у сям'і свабодных народаў. 500-годдзе калмыцкага гераічнага эпаса хвалюе сэрца любога совецкага патрыёта. І ўвесь совецкі народ з вялікай радасцю святкуе юбілей «Джангара», заззяўшага ў праменнях жыццядайнага сонца соцыялізма новым асляпляючым святлом. Эпас зойме пачэснае месца ў скарбніцы культуры братніх народаў вялікай Краіны Соцыялізма.

Е. СІКАР.

Абмеркаванне новых твораў

„КАЛГАСНЫЯ НАВЕЛЫ“

Прачытаўшы мастацкі твор, хочацца набыць новых прыяцеляў, якія-б надоўга засталіся блізкімі знаёмымі, як любімыя героі, учынкам якіх хацелася-б следваць.

Аднак. дзіўнае ўражанне застаецца ад старых, юнакоў і дзяўчат, прачытаўшы «Калгасныя навелы» У. Краўчанкі. Іншы раз нават крыўдна робіцца, што ў цікавых падзеях, пра якія расказвае аўтар, зусім мала месца аддана чалавеку.

Безумоўна, самае моцнае ўражанне з усіх персанажаў навел і апавяданняў пакідае былы хутаранін Сільвестр Наўныка, цяпер калгаснік.

Адзінаццацігадовым хлапчуком ён пачаў свой працоўны шлях. Бацька выправіў яго ў людзі з наказам: «... Чалавек, мой сын, на тое і жыве, каб цярпець». Але гэтыя талстоўскія словы не ўсялілі ў Сільвестра рабскай душы. Першы яго гаспадар. хутаранін Гаўрыла, быў бязлітасны чалавек. Адзінаццацігадовы парабак уцёк ад яго. Наўныка трапляе да скупшчыка быдла, які ашукаў яго, не заплаціўшы вырабленых грошай. Скупшчык знікае ў невядомым кірунку, а галодны, абарваны Сільвестр ідзе ганяць плыты. Мінаў час юнацкага бунтарства, Наўныку захапіла прага да нажывы. Служачы ў млынара, ён марыў набыць багацце і выкарабкацца з нястач.

Ажаніўшыся, Наўныка зноў вярнуўся ў бацькоўскі дом. Яму ўсё больш і больш не дае спакою думка аб тым, каб займець сваю хатку і перабрацца на хутар.

Збыліся яго мары. На паляне Сільвестр паставіў хату, засеяў свой кавалачак зямлі і — па горла валез у даўгі. Думаў, што з часам адпрацуе запазычанае. Але праз тры годы зразумеў — рэшта хутаран таму і багатыя, што на іх працуюць па тры-чатыры парабкі, а ён адзін надрываецца і ніколі, мусіць, не выбярэцца з нястач. Сільвестр зразумеў нікчэмнасць сваіх мараў.

Ён уступае ў калгас, бачачы ў калектыўнай працы адзіна правільны шлях для селяніна, ён пераносіць сваю хату з хутара ў калгасную вёску.

Унутраны свет прадстаўніка старэйшага пакалення аўтар паказаў даволі поўна і цікава ў апавяданні «Застольная Сільвестра Наўнькі».

Ніхто не будзе адмаўляць, што барацьба з капіталістычнымі перажыткамі ў свядомасці совецкіх людзей з'яўляецца злобадзённай тэмай. Тэма барацьбы з рэлігійнымі забабонамі ў свядомасці адсталага насельніцтва своечасова зацікавіла маладога пісьменніка. Але, высунуўшы гэту праблему, аўтар аказаўся бездапаможным і не знайшоў у навеле «Дружба завяла» канкрэтнай сітуацыі для выяўлення агульных ідэй. Сутычкі моладзі і людзей старэйшага пакалення іншы раз здаюцца лішнімі, таму што людзі старой закалкі ўжо вельмі шпарка паддаюцца перавыхаванню. Нараджэнне новай псіхалогіі выражаецца ў большасці выпадкаў словамі. не паказана праламленне гэтых новых пачуццяў на справе. У даным выпадку аўтар скатваецца часамі на шлях фіксатара.

Гэта тлумачыцца тым, што тав. Краўчанку нехапае пісьменніцкай культуры. Прынцыповыя асновы мастацкай творчасці і заключаюцца ў тым, каб правільна адлюстраваць жыццё і дзейнасць чалавека, яго думы і настроі. Імкненне да гэтага ёсць у аўтара. У лепшых сваіх навелах У. Краўчанка спрабуе адыйсці ад ілюстрацыйнасці і паглядзець на жыццё вачамі сваіх персанажаў. Але гэтага прынцыпа ён не вытрымлівае да канца. Напрыклад, у апавяданні «Сюрпрыз» лірычныя пачуцці зніклі сярод рада бытавых фактаў. І апавяданне настрою ператварылася ў нудны бытавы нарыс.

Вядучымі вобразамі ўсіх апавяданняў Краўчанкі з'яўляюцца маладыя людзі. Людзі старэйшага пакалення, у большасці выпадкаў, адыгрываюць ролю кантрастыруючай сілы. Хоць і гэтыя вобразы совецкай моладзі патрабуюць яшчэ больш стараннай адшліфоўкі, але ўжо ў ніжэй згаданых апавяданнях аўтар стаіць на правільным шляху.

У апавяданні «Дарагое пісьмо» аўтар паказвае, наколькі совецкія людзі любяць і шануюць сваю маці-радзіму. У пісьме, прысланым з Далёкага Усходу, чырвонаармеец — удзельнік хасанскіх баёў скромна і цікава расказаў аднасяльчанам, як Чырвоная Армія граміла зарваўшыхся японскіх самураяў. Калгаснікі радуюцца гэтым перамогам, адчуваючы сябе нібы ўдзельнікамі баявых падзей.

Блізкае і дарагое пачуццё абаронцы радзімы знайшло цікавае выражэнне ў апавяданні «Провады».

Такім чынам, мы бачым, што новае жыццё нараджае новыя пачуцці. Значна відазмяніліся і ўзаемаадносіны паміж членамі соцыялістычнага грамадства.

Найбольш ярка, з пункту гледжання дэкларацыйнасці, выражаны пачуцці і надзеі людзей совецкай вёскі ў невялічкай зарысоўцы «На параходзе». Тут не адбываецца ніякіх асаблівых падзей, пісьменнік проста перадае звычайную гутарку пасажыраў, едучых на параходзе.

Два калгаснікі — беларус і яўрэй — радуюцца, што яны дажылі да такога светлага часу, калі жыць стала лепш, жыць стала весялей. Калгаснік-беларус вяртаўся з Кіева і вёз сваім аднасяльчанам дарагі падарунак — радыёпрыёмнік. Ён расказваў аб сваёй сям'і, аб дочках і сынах, якія выйшлі ў людзі і за якіх яму не сорамна перад калгаснікамі.

Калгаснік-яўрэй ганарыцца сваім сынам Барысам, які працуе шоферам і памаладзецку ездзіць на машыне па вуліцах Кіева. Ён абяцае «66 разоў расказаць» суседзям аб тым, што ён бачыў у гэтым цудоўным горадзе. І кожны раз ён перш за ўсё будзе гаварыць пра свайго сына.

Абагульняючы свае думкі, аўтар так ахарактарызаваў замысел зарысоўкі: «Мне хацелася, каб усе людзі рады былі жыццю...»

Гэта мысль з'яўляецца асновай усёй кнігі.

Але, нажаль, увагу чытача паслабляе тая акалічнасць, што большасць герояў гэтай кнігі ўсё-ж намаляваны цмяна. Гэта не таму, што аўтар не ўмее нарысаваць партрэта сваіх персанажаў. Калі яму, напрыклад, спатрэбілася паказаць багамольную манашку, дык ён знайшоў сатырычныя сродкі і падмеціў тыя істотныя рысы, якія зрабілі гэты вобраз агідным. Аўтар нядрэнна валодае формай апавядання, добра ведае сялянскае асяроддзе. І яму нельга прабачыць таго, што ён часта ідзе па шляху найменшага супраціўлення — па шляху рамесніцтва. У паказе людзей і падзей пісьменнік канцэнтрыруе сваю ўвагу не на працэсе фарміравання новай псіхікі калгасніка, а на выніках гэтага фарміравання.

У многіх апавяданнях і навелах, змешчаных у кнізе, прарываюцца рамантычныя ноткі («Каменныя валы» і др.). Але яны знікаюць бясследна, таму што аўтар больш захапляецца вонкавымі з'явамі акружаючага жыцця, а не ўскрывае глыбока імкненняў сваіх герояў у будучыню.

Усе гэтыя недахопы некалькі прыбядзілі змест другой кнігі маладога пісьменніка Ус. Краўчанкі.

А. ЕСАКОЎ.

Ус. Краўчанка. «Калгасныя навелы». Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі. Мінск, 1940 год.

ВЕРШЫ А. КУЛЯШОВА НА РУСКАЙ МОВЕ

Заходні фарпост СССР—Беларусь багата лясамі, садамі, рэкамі; багата шчасцем і радасцю людзей.

Іменна гэта і з'яўляецца любімай тэмай творчасці беларускага паэта Аркадзя Куляшова. У сваіх вершах, асабліва апошняга перыяда, тав. Куляшоў паўстае перад намі, як удумлівы, сур'ёзны і вельмі наглядальны паэт. Наглядальнасць, веданне жыцця і быта калгаснага сялянства, добрасумленныя адносіны да сваёй паэтычнай працы, робяць яго вершы простымі, свежымі, арыгінальнымі.

Творчасць А. Куляшова займае віднае месца не толькі ў беларускай, але і ва ўсёй совецкай паэзіі. Гэта і сцвярджае выхад у свет яго зборніка «Дубрава» на рускай мове.

У святле прад'яўляемых у сучасны момант патрабаванняў да перакладчыка, можна сказаць, што тав. Сідарэнка, які перакладаў вершы А. Куляшова, аднёсся да гэтай справы сур'ёзна і добрасумленна. У зборніку ёсць добрыя пераклады, як, напрыклад, верш «Воблака».

Верш маленькі і я прыводжу яго цалкам, каб даказаць, наколькі глыбока перакладчык пранік у ідэю гэтага верша, як успрыняў вобразы.

У аўтара:

Уткнуўшы ў бераг вудзільно,
Я вуджу раніцою.
А воблака? Плыве яно
І небам, і вадою.
Нарэшце клюнула разок—
І рыбка не малая! —
З пяром гусіным паплавок
Пад воблака нырае.
Стаіў дыханне. Цішыня...
У бок, рукой умелай,
Я падсякаю галаўня,
Цягну з хмарынкі белай.
Вада ў кругах,
Вада ў кругах
І неба ў ёй не тое...
А воблака? Яно ў руках
Трапечацца жывое.

У перакладчыка:

Сижу я с удочкой в руке,
Овеян тишиною.
И облачко плывет в реке
И в небе надо мною.
Вдруг леску дернуло разок,—
Добыча наплывает!
С пером гусиным попловок
Под облачко ныряет.
Привстав, дыханье затая,
Рывком—рукой умелой—
Я подсекаю головня
Под самой тучкой белой.
И небо в водяных кругах
Очнулось от покоя...
А облачко? Оно в руках
Трепещет. как живое.

Тут няма сэнсавых адхіленняў ад арыгінала. Мысль аўтара перадана дакладна і сакавіта. І калі-б усе вершы ў зборніку былі перакладзены таксама ўдала, перакладчыка можна было-б толькі дзякаваць.

Але, нажаль, не ўсе пераклады ў зборніку ўдалыя. Возьмем верш «Юнацкі свет» з аднайменнага цыкла. Па аднаму таму ўжо, што перакладчык пераклаў назву яго так: «Юношеский свет», можна меркаваць аб неглыбокім пранікненні перакладчыка ў значэнне слоў.

Аўтар у гэтым вершы расказвае аб лясным доме, які стаіць «ад казак недалёка» і што:

Мы паўз яго ішлі
Пад сонцам
Пад высокім,
Мы флягі налілі
Кляновым, хатнім сокам.
І вёсны з-за акна
Лічылі нам зязюлі.
Нас клікала вайна,
Мы ў стральбах неслі кулі.

Першы верш дае карціну неабсяжнасці і шырыні, залітай сонцам. Байцы, асветленыя гэтым «высокім» сонцам, ідуць паўз лясную хату і, зайшоўшы да гасціннага лесніка, напаўняюць свае флягі «кляновым, хатнім сокам».

Тав. Сідарэнка пераклаў гэты верш так:

Брели—в поту, в пыли—
Мы под сосной и вязом.
Мы в дом лесной вошли
Наполнить фляги квасом.

Зніклі неабсяжнасць і шырыня, знік салодкі кляновы сок. І апрача таго атрымалася бяссэнсіца: «брели... под сосной и вязом». Колькі гэта часу можна брысці пад сасной і вязам?

У другім вершы аўтар паказвае рост юнакоў—сябе і сваіх аднагодкаў,—якім час адлічвалі зязюлі. Іменна, час. Але была вайна і моладзь брала вінтоўкі і ішла на абарону родных прастораў, роднай зямлі.

Перакладчык рашыў зрабіць інакш:

Судьбу (?) из-за окна
Вещали нам кукушки.
Нас всех звала война,
С собой везли мы пушки (?).

Мысль аўтара аб адлічванні вёсен зязюляй у перакладчыка ператварылася ў забабоны, што нібы зязюля можа прадказваць лёс. А адкуль узяліся «пушки»? Навошта перакладчыку спатрэбілася ўскладняць і рабіць грознай прастору і сакавітую карціну? Верш тлумачыць чытачу, што такое «юнацкі свет».

І воблакі, і дом,
І пыл пад небам гэтым,
І сосны за акном
Заву
Юнацкім светам.

Чытачу ўсё зразумела. А вось ці можна што-небудзь зразумець у перакладзе?

И туч гряду, и дом,
И пыль — вослед лафетам (?).
И сосны за окном
Звать (?)
Юношеским светом.

Як гэта «звать»? Буду клікаць, павінен клікаць, трэба клікаць, ці як? І пры чым тут лафеты?

Надыходзіць вясна і, «кліч зязюлі ўчуўшы з-за ракі», аўтар едзе к сваім землякам. Там ён ловіць рыбу, адпачывае ў цяню ля рэчкі, бярэ касу і ідзе на лугі. Землякам ён сказаў, што жыве на вуліцы Маскоўскай і яны падумалі, што жыве ён недзе «недалёка ад Масквы». Далей у аўтара:

Думаю пасля,
адчуўшы стому,
Што і тут, пад дахам з сінявы,
Я жыхар і вуліцы, і дому,
Ад якога... блізка да Масквы.

Перакладчык, не турбуючыся адшуканнем слова, адэкватнага беларускаму «стома» замяняе яго:

Мнится мне
В часы вечерней дремы...

У вершы «Ранак» паэт заяўляе, што ідзе ў разведку, бо заўтра «рашучы бой». І вось ён трапіў у палон, ворагі загадваюць паказаць «шлях назад». Аўтар-палоннік зварачваецца да прыроды, каб яна ўсё перарабіла, толькі-б ворагі не маглі трапіць у родную краіну:

У родную краіну
Дарогі перайнач...

Гэта значыць перавярні ўсё наадварот, пераблытай дарогі на радзіму.

Не гледзячы на тое, што ўвесь верш перакладзен добрасумленна, гэта месца ў перакладчыка выглядае так:

И не попасть в долину,
В мой край ни вплавь, ни вскачь.

Прычым тут даліна? Навошта «і»? Прастата і даходлівасць верша ўскладнена многаслоўем.

Улічваючы здольнасці перакладчыка тав. Сідарэнкі, трэба адзначыць, што гэтыя парушэнні сэнсу асобных строф дапушчаны ім з прычыны неглыбокага ведання беларускай мовы або па нядбайнасці. Гэта тав. Сідарэнку неабходна ўлічыць у далейшай рабоце над перакладамі.

У цэлым-жа зборнік цікавы, матэрыялы падабраны ўдала і рускія чытачы здолеюць пазнаёміцца з творчасцю аднаго з лепшых маладых беларускіх паэтаў.

К. ЦІТОЎ.

„ЮНЫЯ ЗМАГАРЫ“

Першая кніжка маладога пісьменніка П. Рунца змяшчае ў сабе дзесяць апавяданняў для дзяцей. Большасць апавяданняў прысвечана тэме совецкага патрыятызма, якую аўтар распрацоўвае па двух лініях—героіка грамадзянскай вайны, барацьба з дыверсантамі і шпіёнамі.

Ніхто не стане папракаць аўтара за тое, што ён ідзе па, так сказаць, «прото{}ренной» дарозе і не ставіў сабе мэты ўвайсці ў літаратуру з адменнай, арыгінальнай тэмай. Пра грамадзянскую вайну напісана і будзе напісана багата хвалюючых твораў. Не будуць абмінаць пісьменнікі і тэмы барацьбы з дыверсіяй, шпіянажам—пакуль існуе капіталістычнае акружэнне, тэма гэта не страціць сваёй актуальнасці. Але мы ўправе патрабаваць адыходу пісьменніка ад пэўнай схемы і штампа, адзнака якіх ляжыць на шмат якіх творах, прысвечаных гэтай тэме, зніжаючы іх мастацкую вартасць, сілу ўздзеяння на чытача.

Вось гэтай схемы і штампа не пазбегнуў П. Рунец. Чытаем апавяданне «Жабрак». Як толькі зайшоў у хату незнаёмы стары—жабрак, хлапчук Санька адразу-ж «пачаў уважліва прыглядацца». Жабрак, вядома, глянуў на Саньку і, «сустрэўшыся з ім вачыма, неўзаметку ўздрыгнуў. Санька заўважыў гэта, і яму здалося, што ён недзе бачыў такога чалавека». Колькі па творах апошніх год прайшло жабракоў, якія ад аднаго толькі позірку малога хлапчука «неўзаметку» ўздрыгваюць, а гэтае «неўзаметку» адразу заўважаецца «пільным» дзіцём! Аднаго з'яўлення такога жабрака даволі, каб чытач дасказаў за аўтара далейшы ход дзеі.

Падобны шаблон, які выратоўвае аўтара ад клопатаў шукаць арыгінальнае вырашэнне тэмы, ствараць напружаныя, непаўторныя сітуацыі, знаходзім мы і ў апавяданні «Расплата». Калі хлапчук Сенька ўбачыў у кустах параненага чалавека (польскі жандар), тут зноў «твар гэтага чалавека здаўся яму дужа знаёмым».

У апавяданні «Піонерка Валя» дзяўчынка, шукаючы ў пуні квактуху (сітуацыя таксама досыць вядомая), знаходзіць замест яе «незнаёмага чалавека»—і чытачу ўсё зразумела. Праўда, гэты «незнаёмы чалавек» не ўздрыгваў ад позірку Валі, але Валя чула ад бацькі: «Кажуць, у нашым сельсовеце хаваецца шпіён з-за мяжы». Аўтар ужыў тут другую, але не менш зацяганую, шаблонную матывіроўку далейшых паводзін свайго героя.

Мала задумваецца П. Рунец і над канцоўкамі большасці сваіх апавяданняў.

Адна канцоўка: «Праз некалькі дзён рабяты атрымалі пісьмо. Начальнік НКВД выносіў падзяку за праяўленую пільнасць, здагадлівасць і смеласць».

Другая: «А праз поўгадзіны трое пагранічнікаў вялі злоўленага шпіёна па вуліцы вёскі».

Гэтыя, газетнага характару, прыпіскі зусім лёгка адкідаюцца і твор нічога не траціць. Не траціць нічога твор, калі адкінуць і канцоўкі такога маралізуючага характару, як: «Пасля гэтага ён закінуў сіло і клетку і дагаварыўся з Толікам больш ніколі не лавіць птушак», або «трэба кніжкі любіць, бо ў кніжках вялікая сіла», або «пасля гэтага здарэння бабуля назаўсёды перастала баяцца могілак і верыць у мерцвякоў».

Аўтар пісаў свае апавяданні для дзяцей і, відаць, баяўся, што яго чытачы не здолеюць самі зрабіць належных вывадаў. Аўтар спяшаецца на дапамогу чытачу, стараецца ўсё растлумачыць, не заўважаючы таго, што дыдактычнасць яго твору праз меру агаляецца. І не толькі ў канцоўках. Вось хлапчук («Пецька») развітваецца з любым яму чырвонаармейцам: «Цяжка было расставацца з гэтым добрым і смелым чалавекам—змагаром за шчасце працоўных». Вось характарыстыка маці хлапчука Янкі («Знаходка»): «Яна такая чэсная і сумленная калгасніца». Сіла мастацтва ў тым і заключаецца, што яно непрыкметна, без націску і падказкі, намаўляе чытачу вывады, якія патрэбны аўтару.

Ёсць у зборніку П. Рунца апавяданні, у якіх аўтар імкнуўся адыйсці ад схемы, ад запазычанага з кніг штампа. Гэта яму не заўсёды ўдаецца. Апавяданне «Дружба»—пра хлапчука, які ўцякае з дому ў чырвонаармейскую часць, з якою пайшоў яго прыяцель-чырвонаармеец, — па сутнасці з'яўляецца толькі пачаткам незакончанай аповесці. Прачытаўшы ў канцы старонкі словы: «Колю залічылі ў часць. Пачалося баявое чырвонаармейскае жыццё», чытачы, чакаючы расказа пра гэта «баявое чырвонаармейскае жыццё», з цікавасцю перагорнуць старонку і—убачаць новы загаловак. Апавяданне абарвана на завязцы яго.

Даволі цікавае апавяданне «Таварышы» пазбаўлена сюжэта. Не відаць у ім і выразнай тэмы—ніто карысць дружбы, ніто шкоднасць свавольства, гультайства.

Найбольш удалося аўтару апавяданне «Здарэнне з бабуляй» (пра бабулю, якая баялася хадзіць увечары каля могілак). З боку формы гэта кароткае апавяданне стаіць на грані анекдота. Можа блізасць да кароткага, фальклорнага тыпу апавядання і дапамагла аўтару цікава вырашыць тэму.

Вельмі станоўчай рысай П. Рунца з'яўляецца яго назіральнасць, разуменне і ўмелае пранікненне ў псіхалогію яго герояў-дзяцей. Іх паводзіны, рэакцыі на падзеі, гаворка—даюцца аўтарам вельмі натуральна, праўдзіва. Вось у хлапчука Сенькі пытаюцца пра лодку (апавяданне «Расплата»). Ён адказвае: «Няма. У нашага суседа Сідара ёсць. Я часта катаюся на ёй. Яна яшчэ новая». Гэта рэпліка, гэтае «яна яшчэ новая»—рэльефна рысуюць нам фігуру хлапчука. Аднак, трапна паказваючы сваіх герояў знешнімі рысамі, аўтар забывае аб неабходнасці раскрыць перажыванні сваіх герояў там, дзе без гэтага нельга абыйсціся. Так, пра ваганні таго-ж Сенькі, яго прыход да ўсведамлення, што ворага трэба выкрыць, аўтар расказаў, ён не паказаў перажыванняў свайго героя. Гэтак сама расказваецца, а не паказваецца, як Янка («Знаходка») вырашыў занесці знойдзеныя ім грошы згубіўшаму іх старшыні калгаса.

П. Рунец не дрэнна валодае мовай. Яна ў яго досыць жывая, блізкая да народнай, відаць, што ў выбары слоў аўтар не абмежаваны. І таму прыкра бачыць такія зацяганыя моўныя штампы, як: «але для Сенькі нічога не існавала», «ён увесь ператварыўся ў зрок», «сэрца яго ліхаманкава затрапяталася і кроў ударыла ў твар», «памяць не здрадзіла Сеньку», «тут Віцька даваў волю сваёй фантазіі», «па целе прабеглі нервовыя дрыжыкі». Аўтару лёгка было-б пазбегнуць іх.

Першая кніга П. Рунца не зусім удалая. Але яна сведчыць нам пра пэўныя магчымасці аўтара. Падмацаваныя ўпартай вучобай, яны прынясуць і поспех.

Хв. ШЫНКЛЕР.

П. Рунец. «Юныя змагары». Дзярж. выдав. пры СНК БССР. Рэдакцыя дзіцячай літаратуры. Мінск, 1940.

НА ЮБІЛЕЙНЫ ПЛЕНУМ, ПРЫСВЕЧАНЫ „ДЖАНГАРУ“

У сталіцы Калмыцкай АССР г. Элісце 6 верасня адкрываецца юбілейны пленум Саюза пісьменнікаў СССР, прысвечаны 500-годдзю гераічнага калмыцкага народнага эпаса «Джангар».

Беларускія паэты М. Клімковіч, М. Танк, Э. Агняцвет, В. Таўлай пераклалі да юбілея на беларускую мову паасобныя песні «Джангара».

Для ўдзелу ў работах пленума 31 жніўня ў г. Элісту выязджае дэлегацыя беларускіх пісьменнікаў у складзе М. Танка, Ф. Пестрака і В. Вольскага.

А. КУЧАР

„САЛАЎІ СВЯТОГА ПАЛІКАРА“ Р. МУРАШКІ

Асноўны сэнс рамана Рыгора Мурашкі «Салаўі святога Палікара» заключаецца ў паказе працэса паступовага вызвалення чалавека ў совецкіх умовах з-пад улады брудных інстынктаў і пачуццяў, у моцным і смелым ганьбаванні аўтарам усіх цёмных сіл, што перашкаджаюць будаванню новага жыцця.

Пісьменнік як-бы хоча сказаць сваім творам: змагайцеся мацней і смялей супроць усякай пошасці, якая імкнецца дзеля сваёй нажывы таптаць у гразь чэсных совецкіх людзей, усяляк атручваць ім жыццё. Больш прастора лепшым пачуццям людзей, няхай яны адчуваюць радасць свайго існавання, няхай іх не скоўваюць ні сямейныя, ні бытавыя ланцугі, няхай яны вольна дыхаюць, кахаюцца, ненавідзяць сваіх ворагаў.

У гэтым мы бачым вялікае значэнне твора Мурашкі для беларускай совецкай літаратуры, у якой гэта праблема ў такім шырокім аб'ёме ставіцца ўпершыню. Гэта і дае нам права лічыць раман «Салаўі святога Палікара» бясспрэчным поспехам аўтара, не гледзячы на сур'ёзныя, можна сказаць, не толькі зрывы, але і правалы, якія ў ім ёсць.

У параўнанні з мінулымі творамі Мурашкі, раман «Салаўі святога Палікара» — твор значна большай мастацкай спеласці, эканоміі ў сродках выражэння, глыбейшага пранікнення ў псіхалогію людзей. Аўтар у гэтым рамане часткова пазбавіўся сантыментальна-слязлівага стылю, які быў для яго характэрны раней. Мова Мурашкі стала больш простай і суровай.

Рыгор Мурашка паказаў у сваім рамане вёску на тым этапе яе развіцця, калі, пасля арганізацыйнага перыяда ў калгасным будаўніцтве, пачалося змаганне за ўмацаванне калгасаў, за большэвізацыю іх. Гэта быў 1933 год — год радаснай творчай працы і цяжкасцей.

Пісьменнік далёкі ад усякай лакіроўкі калгаснага жыцця. У гэтым сэнсе яго твор палемічна завойстран супроць усіх тых пашлякоў, якія, пішучы аб калгасным будаўніцтве, мазалі ружовым сіропам рэчаіснасць, стваралі ідылічных пейзанаў-калгаснікаў. Рыгор Мурашка піша суровую праўду жыцця, якая і радаснейшая і



Р. Мурашка

больш цяжкая, чым пастаралі лакіроўшчыкаў.

Аўтар паказвае нам галерэю брудных прадстаўнікоў старога свету — кулакоў, чыноўнікаў, падхалімаў, чорных махляроў, прахадзімцаў, якія імкнуцца разлажыць калгас знутры. Гнеў і нянавісць пісьменніка супроць іх такія вялікія, што ён ужывае ўсе даступныя яму сродкі ганьбавання, аж да гратэска і шаржа ўключна.

Праўда, трэба адзначыць, што ў асобных раздзелах карціна, створаная Мурашкам, выглядае залішне змрочнай. Аўтар не заўсёды правільна размяркоўвае ў сваім творы святло і цень. У выніку асобныя вобразы і малюнкі выглядаюць залішне ўтрыраванымі, у іх вельмі згушчаны фарбы. Пісьменнік часамі канцэнтрыруе ўвагу выключна на адмоўных з'явах рэчаіснасці.

Найбольш характэрны ў гэтых адносінах войстра-гратэскны паказ паходу на хутар «Палявое» кулацкай банды на чале з Антосем Салаўём.

Аднак Рыгор Мурашка стварыў у рамане «Салаўі святога Палікара» і рад станоўчых вобразаў людзей, якія імкнуцца да чыстага і чэснага жыцця і змагаюцца супроць цёмных сіл, што перашкаджаюць гэтаму чэснаму і чыстаму жыццю. Персанажы, у якіх увасоблена ідэя рамана,— Яніна, Гарбач, Анішчык, Позняк, Галаскок. Яны і з'яўляюцца найбольш моцнымі вобразамі рамана.

Лепшы вобраз кнігі Мурашкі—вобраз Яніны. Яна таксама, як і Анішчык і Гарбач, увасабляе ў сабе імкненне жыць чэсна, праўдзіва. Яе мучыць тое, што мучыць і іх: бруд, прытворства, подлае ашуканства. Яніна шукае асабістага шчасця ў жыцці. У яе шмат энергіі, сілы, маладосці. Гэтай жанчыне самой крыху сябе шкада. Такая маладая і маральназдаровая, яна павінна гінуць у брудзе і страшных бытавых умовах, якія стварылі ёй бацька — кулак Мысліцкі і муж — Антось Салавей. Яніне ўласціва і рамантычная мара. Але ўсё гэта ў яе набывае знадворную абалонку падкрэсленай грубасці, некаторай нават долі распушчанасці, хоць душа ў яе чыстая і сумленная. Гэтая знадворная абалонка грубасці патрэбна ёй, бо інакш жыццё яе з мужам ператварылася-б у суцэльную пакуту.

Аўтар смелымі і моцнымі фарбамі намаляваў вобраз Яніны.

У пачатку яна ненавідзіць Анішчыка. Ён зняважыў яе, адвярнуўшыся ад яе, прыгожай, здаровай, прывабнай. Гэта карціна бліскуча напісана і з'яўляецца адной з самых моцных у творы.

Цудоўна перадана ў гэтым малюнку росная летняя раніца, імкненне Яніны ў халоднай расе ўтапіць сваё гора. Вельмі тонка праз гісторыю з мёдам Мурашка дае нам зразумець пакуту зняважанай Яніны.

Але нянавісць Яніны да Анішчыка—гэта толькі сродак, каб адвесці сваю велізарную злосць ад галоўнага рэчышча — ад усёй кулацкай банды, што ўзначальваецца яе мужам, а таксама бацькам. Яніна па свайму характару добрая і справядлівая.

Яе сіла, зграбнасць і адначасова нервовая ўзбуджанасць — ёсць толькі знадворная праява яе жадання чэснай працы, жаданне на карыснай людзям працы паказаць сваю энергію. Адно ласкавае слова Гарбача расчуліла яе незвычайна. А яго сантыментальныя казкі знаходзяць жывы водгук у яе, здавалася-б, зачарствелай душы.

Яніна — вобраз глыбока народны. Нездарма Гарбач да яе дапасоўвае цудоўную народную песню, якую спяваюць у час зажынак.

«Павень, ветру, да павень,
Да задай халадосці
Да маёй маладосці.
Каб я ў полі не пацела,
Да дадому не хацела,
У мяне дома не свой бацька,
У мяне дома люты свёкар.
Страшне мяне ў вароцейках,
З цясовенькім вядзёрачкам,
З шаўковымі восілкамі...

Усё адно, як тую песню спявалі Яніне, думаў Гарбач, гэтак падобным было жыццё яе да жыцця невядомай нявехны. Ён стаяў не сатупіўшы з месца, пакуль не даспявалі да канца. А песня спявалася доўга, журботна-цягутка... Кожны радок спявалі па два разы і далёка-далёка ішлі радасныя спевы вечаровым лесам, звінючы ў высокіх, роўных, як струны, хвоях».

Гэта карціна напісана рукой вопытнага майстра, да таго яна глыбока перадае народную душу. І выбар самай песні, і трапная перадача гучання вечаровай зажынкавай песні, і дапасаванне яе да лёсу Яніны — паказваюць на вялікую наглядальнасць аўтара, уменне ўбачыць найбольш яркае і паэтычнае ў жыцці.

Сама Яніна таксама ўсведамл[illegible] ці лёс «па-народнаму»:

«Пайду ў поле шукаць долі», успамінае яна словы з бывалішняе народнае песні. Яна з радасцю абмінула-б поле гэтае, пакінула-б за сабою і лясы і балоты, і гэтыя хаты, і свае невялічкія радасці і гора, і пайшла-б вось як стаіць, адна, са сваёй тугою, у белы свет».

Пад уплывам сантыментальнай казкі Гарбача, душа Яніны прачынаецца. Яна бачыць нікчэмнасць свайго жыцця і шукае выйсця.

Моцна перадае аўтар гэтае нараджэнне новых пачуццяў у Яніны:

«Незнаны шырокі свет адчыніўся раптам перад яе вачыма і здзівіў яе... сваёй навізною і сваёй раптоўнасцю... І яна заспявала ўрачыстую песню волі.

— Чаго ты, крычыш?—пытае Алімпа.

— Што гэта за новая мода спяваць без слоў? — гаворыць Анэлька».

Жаданне Яніны ўзляцець, яе нястрымная радасць з прычыны таго, што адчула ў сабе новыя сілы, перадана вельмі праўдзіва і паэтычна. І як моцна гэта гучыць: «Што гэта за новая мода спяваць без слоў?» Ім, падругам Яніны, не зразумець, што для песні Яніны патрэбны новыя словы, якія яшчэ не створаны.

Яніна —чалавек працы і душа яе аж гарыць на працы:

«Хочацца нарабіцца да поту, далоняй абперці росны твар і напіцца з біклагі квасу».

У рамане Яніна прыходзіць да адкрытай барацьбы з варожымі совецкаму ладу людзьмі. Антосю Салаўю яна кажа:

«Абрыдла мне глядзець, як вы светам круціце. Вас выбіралі і ставілі дабро і справядлівасць народу рабіць, а вы яму зло толькі адно думаеце».

І тое, што Яніна ідзе ад свайго мужа ў свет шукаць другога жыцця, глыбока апраўдана ў творы. Аб гэтым яна і марыла ў песні.

Другім па значнасці ў творы з'яўляецца вобраз Якіма Анішчыка. Гэты чалавек з'яўляецца ўвасабленнем сялянскай працавітасці і сумленнасці. Ён дамагаецца толькі аднаго, каб яму далі магчымасць працаваць, гадаваць і карміць сваіх дзяцей. Але кулакам і ворагам ён, як чалавек чэсны, небяспечны і шкодны і таму яны імкнуцца знішчыць яго. А ён, як лясны звер, адчуваючы за сабою пагоню ворагаў, становіцца ўсё больш жорсткім, суровым і рашучым. Ён не даецца ім у рукі і змагаецца не на жыццё, а на смерць. А па сутнасці і ў яго пад знадворнай абалонкай хмурасці і нелюдзімасці захавана чулае сэрца.

Ворагаў, кулакоў суровыя Анішчыкавы словы паляць, як агнём.

Вось што ён гаворыць Храпавіцкаму аб яго бандыцкім мінулым: «... Стогнуць паначы нявінныя душы за казіным бродам...»

Найбольш цікава вобраз Анішчыка раскрыт у апошніх раздзелах рамана праз сон Гарбача.

Анішчык шукае праўды і ён яе знойдзе. Але пошукі гэтай праўды прыроўніваюцца да пошукаў вады ў перасохлым калодзежы. Анішчык разграбае жвір рукамі, каб паказалася вада. бо яго мучыць смага. Смага мучыць і Гарбача. Гарбач шукае махання. Анішчык—радаснага жыцця.

Вельмі тонка тут напісана аб праменнях, якія загараюцца на шыбах тады, калі сонца яшчэ няма, аб пошуках вады Анішчыкам.

Такім чынам, вобраз Анішчыка адзін з самых моцных у рамане Мурашкі. Але, малюючы Анішчыка, аўтар часамі схільны да натуралізма. Так, натуралістычна-стылізавана заява Анішчыка, адрасаваная Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту і Совету Народных Камісараў.

Гарбач таксама ўвасабляе асноўную ідэю рамана. Людзі народжаны для радасці і шчасця. Соцыялістычны лад дае ўсе магчымасці для шчаслівага і сумленнага жыцця. І трэба бязлітасна знішчаць усіх тых, хто брудзіць совецкі лад, хто перашкаджае гэтаму радаснаму і сумленнаму жыццю. Такімі марамі жыве Гарбач.

Гарбач — рамантык. Ён незвычайна чысты ў сваіх марах аб дзяўчатах. Ён склаў у сваім уяўленні вобраз той [illegible] ён пакахаў — чысты да праз[illegible] Але Гарбачовы мары аб гэтай [illegible] най дзяўчыне маюць адценне [illegible] тальнае.

У процілежнасць рамантыцы [illegible] ментальным настроям Гарбача ў [illegible] жыцці, у грамадскай дзейнасці ён [illegible] ваецца як чэрствы і суровы чалав[illegible] войстра ненавідзіць усялякую ф[illegible] подласць.

У ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ССП БССР

Партыйная арганізацыя Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР 27 жніўня на сваім сходзе абмеркавала рашэнні Ліпеньскага пленума ЦК ВКП(б). З дакладам аб выніках Ліпеньскага пленума выступіў тав. М. Лынькоў. Дакладчык падрабязна расказаў аб рашэннях пленума і аб тым, як выпаўняецца Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня ў Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР, у апараце Саюза.

Дакладчык адзначыў меўшае месца парушэнне Указа кіраўнікамі праўлення ССП БССР, якімі быў дадзен дазвол некаторым пісьменнікам-супрацоўнікам кабінета маладога аўтара і журнала «Полымя рэволюцыі» браць на чытку рукапісы на дом і ў сувязі з гэтым ухадзіць на дзве гадзіны раней з работы. Не ўсё зроблена па ўшчыльненню апарата, загрузцы рабочага дня кожнага работніка. Ёсць шмат недахопаў у дзейнасці Літфонда.

Дакладчык узняў і рад прынцыповых пытанняў па большай актывізацыі і ўздыму якасці творчай работы пісьменнікаў. Ёсць выпадкі безадказных адносін пісьменнікаў да выпаўнення сваіх дагаворных абавязацельстваў перад выдавецтвам, кіностудыяй і мастацкімі арганізацыямі БССР. Гатовыя творы не заўсёды абмяркоўваюцца пісьменнікамі, не атрымліваюць усебаковай папярэдняй ацэнкі, не заўсёды маюць кваліфіцыраваную рэдактуру. У выніку гэтага ў свет выходзяць часам няпоўнацэнныя, нізкія па сваіх якасцях творы. Адсутнічае які-небудзь плануючы пачатак у рабоце пісьменнікаў, у арыентацыі іх на распрацоўку найбольш важных і актуальных тэм нашай рэчаіснасці. Асобныя пісьменнікі, якія маглі-б па сваёй кваліфікацыі і даравянню быць творча больш актыўнымі, працуюць часам маруднымі тэмпамі, вяла, доўга трымаючыся адной тэмы, часам нават не маючай актуальнага значэння. Недапушчальна паслабілі сваю работу творчыя секцыі Саюза совецкіх пісьменнікаў.

Па дакладу выказаліся таварышы Стаховіч, Мазо, Крапіва, Клімковіч, Гусеў, Рудзько. Выступаўшыя адзначылі выключна вялікае значэнне рашэнняў Ліпеньскага пленума ЦК ВКП(б), накіраваных на далейшы ўздым сілы і магутнасці нашай радзімы, на большэвіцкае ўмацаванне дзяржаўнай, працоўнай і партыйнай дысцыпліны. Разам з гэтым яны высунулі рад практычных прапаноў па выпаўненню Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета ад 26 чэрвеня, па перабудове работы апарата Саюза совецкіх пісьменнікаў і творчай работы пісьменнікаў. Усе выступаўшыя сыходзіліся на тым, што праведзенае скарачэнне штатаў апарата —недастатковае. На аснове поўнай загрузкі васьмігадзіннага рабочага дня кожнага супрацоўніка, можна яшчэ больш ушчыльніць платны апарат праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР, рэдакцый, Літфонда, творчых секцый ССП БССР. Патрэбна прыцягнуць да актыўнай работы ў праўленні ўсіх членаў праўлення ССП БССР.

Выпаўненне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР патрабуе ад кожнага пісьменніка ўздыму тэмпаў і прадукцыйнасці ў творчай рабоце, узорнага захавання працоўнай і дзяржаўнай дысцыпліны.

Сход партыйнай арганізацыі Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР аднадушна адобрыў рашэнні Ліпеньскага пленума ЦК ВКП(б), прыняўшы іх да няўхільнага выпаўнення. Сход асудзіў меўшае месца ў апараце Саюза пісьменнікаў парушэнне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР — выданне таварышамі Лыньковым і Клімковічам няправільных загадаў, якія потым былі адменены. Партыйная арганізацыя ўхваліла канкрэтныя мерапрыемствы па ўмацаванню працоўнай дысцыпліны і перабудове работы ў Саюзе совецкіх пісьменнікаў на аснове Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

П. В. ШЭЙН

27 жніўня споўнілася 40 год з дня смерці Паўла Васільевіча Шэйна, вядомага этнографа і збіральніка рускага і беларускага фальклора.

П. В. Шэйн нарадзіўся ў 1826 годзе ў Магілеве ў даволі заможнай сям'і яўрэя-гандляра. Слабы ад нараджэння, хлапчук з пяці год усё-ж пачаў наведваць яўрэйскую школу, вучыўся чытаць і пісаць па-яўрэйску. Дзіцячыя хваробы не далі дзіцяці магчымасці працягваць школьную асвету, а на 13-тым годзе, пасля цяжкай гарачкі, ён страціў здольнасць хадзіць. У 1843 годзе бацька Шэйна адвёз яго ў Маскву на лячэнне. Тры годы цягнулася лячэнне. Але Шэйн на ўсё жыццё застаўся са зведзенымі пальцамі рук і дрэнна рухаючыміся нагамі.

Перад юнаком-калекам паўстала пытанне: што-ж далей? Заставацца ў Маскве яму, як яўрэю, было немагчыма: закон аб рысе аседласці яўрэяў не дазваляў яму жыць у Маскве, а ехаць у свой родны горад, у асяроддзе коснае і кансерватыўнае, — яму не хацелася. За час знаходжання ў больніцы Шэйн навучыўся чытаць і пісаць па-руску, зацікавіўся рускай мастацкай літаратурай, а немцы—ардынатары больніцы дапамаглі яму авалодаць нямецкай літаратурнай мовай. Практыкаваўшыя ў больніцы студэнты забяспечвалі яго кнігамі. Пушкін і Жукоўскі, Гётэ і Шыллер адкрывалі перад юнаком новы свет.

З 1850 года пачынаецца педагагічная дзейнасць П. В. Шэйна. Не атрымаўшы нават сярэдняй асветы, ён мог выкладаць толькі ў ніжэйшай школе. Педагагічную работу Шэйн некалькі год вёў у якасці хатняга настаўніка ў памешчыцкіх сем'ях (у Тверской, Разанскай, Сімбірскай губернях). Выкладаў ён у Маскве ў адной з нядзельных школ, у школе Л. Н. Талстога ў Яснай Паляне, быў настаўнікам і наглядчыкам павятовых вучылішчаў у Туле і Епіфані. У 1865 годзе П. В. Шэйн атрымаў прапанову заняць месца настаўніка нямецкай мовы ў Віцебскай гімназіі. Пасля Віцебска мы бачым Шэйна на працягу некалькіх год настаўнікам гімназіі ў гарадах Шуя, Зарайск, Калуга.

У 1859 годзе паяўляецца першая друкаваная работа Шэйна. Прафесар О. М. Бадзянскі друкуе у «Чтениях в обществе истории и древностей российских» сабраныя Шэйнам у Сімбірскай губерні «Русские народные былины и песни».

З таго часу на працягу 40 год Шэйн самаадцана працаваў на абраным полі дзейнасці, не глядзячы на слабасць здароўя і матэрыяльную незабяспечанасць. Шматгадовыя вандраванні яго па Расіі далі магчымасць пабываць у многіх губернях і сабраць вялікую колькасць матэрыялаў.

У 1868—70 гг. у тых-жа «Чтениях» друкаваліся «Русские народные песни» Шэйна (асобны адбітак пад тым-жа загалоўкам—Масква. 1870).

У 1898 годзе Акадэмія навук выдала першы выпуск вялікай работы Шэйна пад загалоўкам «Великорусс в своих песнях, обычаях, обрядах, верованиях, сказках, легендах и т. п.» Друкаванне другога выпуска зацягнулася, ён выйшаў толькі ў 1900 годзе, за два месяцы да смерці збіральніка.

Апублікаваныя Шэйнам рускія народныя песні стварылі аўтару вядомасць і сталі прадметам вывучэння буйнейшых рускіх вучоных (Н. І. Кастамараў, Орэст Міллер, Ф. І. Буслаеў, А. Н. Весялоўскі, А. А. Патэбня, М. А. Коласаў і інш.), а таксама замежных (работы англічаніна Ральстопа і немца Гроспіча).

Але яшчэ большы ўклад зрабіў П. В. Шэйн у беларускую навуку.

Сямігадовую службу ў Віцебскай гімназіі П. В. Шэйн выкарыстаў не толькі для вывучэння беларускай мовы і запісаў матэрыялаў. Ён уцягвае ў сваю збіральніцкую работу мясцовую інтэлігенцыю (пераважна настаўнікаў).

За сем год жыцця ў Віцебску П. В. Шэйн з дапамогай сваіх супрацоўнікаў сабраў вялікую колькасць матэрыялаў. З іх ён падрыхтаваў першы беларускі зборнік песень, маркуючы з часам выдаць асобна не ўвайшоўшы ў яго матэрыял. Прадстаўлены у «Русское Географическое Общество», зборнік атрымаў высокую ацэнку і быў надрукован у 1873 годзе у «Записках» таварыства. У 1874 годзе зборнік выйшаў асобным выданнем пад загалоўкам «Белорусские народные песни с относящимися к ним обрядами, обычаями и суевериями, с приложением об'яснительного словаря и грамматических примечаний. Сборник П. В. Шейна». (СПБ, 1874, 562 стар.).

У зборніку надрукавана 870 песень, запісаных, галоўным чынам, у Віцебскай губерні. Поспех зборніка быў вялікі. Геаграфічнае таварыства ўзнагародзіла яго залатой медаллю, Акадэмія навук па водзыву прафесара Орэста Міллера прысудзіла аўтару Увараўскую прэмію.

Праз тры годы П. В. Шэйн звярнуўся ў Акадэмію навук з прапановай даручыць яму паехаць для далейшага збірання помнікаў народнай творчасці ў Беларусь. Акадэмія навук прыняла гэту прапанову і даручыла Шэйну паехаць у Мінскую, Магілеўскую і Віцебскую губерні. Так пачаліся паездкі Шэйна ў Беларусь, спачатку поўтадовая, а пасля штогадовыя на свой кошт.

У 1887 годзе пачалося друкаванне сабраных П. В. Шэйнам матэрыялаў. На працягу наступных 15 год выйшла тры тамы (у чатырох кнігах) пад загалоўкам «Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-западного края, собранные и приведенные в порядок П. В. Шейном». Гэты вялікі зборнік (у агульнай колькасці больш 2500 старонак) ахоплівае усе жанры фальклора з усёй тэрыторыі Беларусі, даваў багацейшыя матэрыялы для вывучэння этнаграфіі, фальклора і мовы Беларусі. Смерць застала Шэйна ў час друкавання апошняй кнігі «Материалов».

У 1900 годзе П. В. Шэйн паехаў на курорт у Дубельн, поблізу Рыгі. Тут ён адчуў рэзкае пагоршанне ў застарэлай хваробе печані. Адзін з быўшых на курорце яго прыяцеляў граф. П. Н. Жуковіч прывёз яго 12 жніўня ў Рыгу і памясціў ў гарадскую больніцу. Тут раніцой 14 (27) жніўня П. В. Шэйн памёр. На пахаванні яго прысутнічалі граф. П. Н. Жуковіч, дырэктар адной з мясцовых гімназій Е. В. Бяляўскі з жонкай і адзін з супрацоўнікаў газеты «Рижский Вестник».

У тым-жа годзе Этнаграфічны аддзел таварыства любіцеляў натуразнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі (у Маскве), з мэтай увекавечання памяці нябожчыка, адкрыў падпіску сярод членаў таварыства і пачытацеляў П. В. Шэйна на пабудову помніка на яго магіле. Адкрыццё помніка адбылося 19 жніўня 1901 года ў прысутнасці невялікай групы рыжскай рускай інтэлігенцыі (чалавек 40—50). Помнік яўляе сабою крыж з цёмнага граніта на п'едэстале—кубе, на адным з бакоў якога было высечана: «П. В. Шэйн, збіральнік помнікаў рускай народнай творчасці. 1826—1900», а на другім: «Помнік пастаўлен у 1901 г. пачытацелямі навуковых прац Шэйна».

Калека па стану здароўя, самавук па асвеце, П. В. Шэйн, дзякуючы настойлівай, упартай працы, зрабіўся буйным этнографам і фальклярыстам.

Ён прывёў у сістэму і перавыдаў многія матэрыялы сваіх папярэднікаў па збіранню беларускага фальклора, зрабіўшы іх больш даступнымі для карыстання. Ён сам запісаў шмат новых матэрыялаў.

Па слядах Шэйна і другога вядомага беларускага фальклярыста Е. Р. Раманава, пайшоў рад прадаўжальнікаў іх прац (у тым ліку Н. Я. Нікіфароўскі, А. К. Сержпутоўскі, І. А. Сербаў).

Не падлягае ніякаму сумненню, што наша навука захавае імя Паўла Васільевіча Шэйна. Беларускі народ яшчэ доўга будзе перачытваць сабраныя Шэйнам для патомства помнікі творчасці папярэдніх пакаленняў, а беларускія этнографы, фальклярысты і лінгвісты яшчэ доўга будуць зварочвацца к Шэйну за матэрыяламі для сваіх прац.

ІВ. КУЗЬМІН.



Беларускае дзяржаўнае выдавецтва здало ў друк зборнік беларускіх народных казак у апрацоўцы Якуба Коласа. Зборнік ілюстрыраван мастаком Ціхановічам. Рысункі В. Ціхановіча да казак «Селянін, воўк і лісіца» і «Воўк-дурань».

Эдзі Агняцвет

УЗБЕКІСТАН

ТУРСУНОЙ

Зорка пакацілася на дол,
На тваю магілу, Турсуной *).
Быццам крыллі залацістых пчол
Іскры задрыжэлі над зямлёй

І пагаслі між зялёных траў.
Зноў навокал цемра і спакой.
Толькі салавейка не змаўчаў
Над тваёй магілай, Турсуной.

Ён заплакаў быццам,
затужыў,
Па птушынай звычцы—нараспеў.
Можа, гэты міг у міражы
Прамільгнула ля яго,
ля дрэў,
Дзеўчына з чарняваю касой, —
Мілая пявуння Турсуной?

Мо' згадаў ён яблынь белы край,
Воблака празрыстае ўгары, —
Як спрачаўся з ёю да зары,
Як любіў іх кожнай кветкай май?

Як прасіла песняй:—Вецер, стой,
— Мне-б з табой памчацца да
вышынь!
А за песню вораг задушыў
Дзеўчыну з чарняваю касой...

Чулі вы ўначы ў глушы алей,
Як гаворыць з ёю салавей?

— Вырас клён над курганом тваім,
Над табой цвіце вясной гранат.
Ты-ж не спіш,
не ведаеш зусім, —
Мы навек прагналі шарыат.

Сёння толькі-б жыць табе і жыць.
І да сэрца не прышла-б зіма.
Абудзіся,
Слова хоць скажы!
Чуеш? Запявае Халіма **).
І смуткуе ў цішыні са мной
На тваёй магіле, Турсуной.

*) Паводле шарыата жанчыне забаранялася быць артысткай. Турсуной — выдатная узбекская спявачка, якую па-зверску забіў муж за выступленні на сцэне.

**) Халіма Насырава—народная артыстка СССР.

ЧАЙХАНА

А ці зналі вы, ці не,
Як вясёла ў чайхане?
Як пад бубен і дутары
Наліваюць поўна чары —
За пшаніцы першы сноп?
Як гасцей вітаюць — «хоп!»

Дзень вам добры,
дзень вам добры,
Садаводы, земляробы,
Што ўначы не дасыпалі,
Ўсё зямельку даглядалі.
І прынесла нам яна
Хлеба,
яблыкаў, віна.
У шаўковыя халаты
Апранула ўсіх дзяўчатак,
Надарыла нас з табой
Бурштыноваю айвой.

Навучы мяне, таварыш,
Як спяваюць пад дутары?
Я-ж пацешу чайхану,
Я хусцінкаю ўзмахну,
Як мяцеліца крылом.

Прыгадаю сосны, дом,
Хлопцаў з роднага сяла —
— «Мяцеліца замяла!»

Ты задзівішся.
Ніколі
Ты не чуў завей у полі,
Ні мяцеліц, ні снягоў.
Я ўзмахну хусцінкай зноў,
Усміхнуся, закружуся, —
Да спаткання ў Беларусі!
Прыязджай,
напомніш мне,
Як вясёла ў чайхане.

ВІНАГРАДНІК

Я іду цяністым садам.
Спеюць гронкі вінаграда.
У тамленні, у знямозе
Да зямлі звісаюць лозы, —
Хочуць
пырснуць ненарокам
На мяне пахучым сокам
І ракою залатою
Зашумець,
запець на тоях!*)
Вунь прымчаўся вецер з высяў,
За галінкі зачапіўся,
Кожнай кісцю лозы машуць.
Як вазьму зімой я чашу,
Маладым віном напоўню, —
Гэты дзень
і сцежкі ўспомню,
Дзе ішла,
дзе ў садзе звонкім
Вінаграда спелі гронкі.

*) Той — пір.

СЮЗАНА

Ты сказаў:
— Нявестай будзь маёю!
Пакахаў як зорку,
як вясну.
З той пары начамі
ў неспакоі
Вышываць я стала сюзану *).

Я прынесла-б ёй адной адразу
Ўсе фіялкі з лесу і палёў.
Я хацела з гор забраць алмазы,
Я склікала з неба жураўлёў.
І цішком ад маці вышывала, —
Я не помню, год ці паўтара.
Фарбы ўсе пад восень адшукала
І сказала сэрца мне:
—Пара!
Сюзана на дзіва!
Ўся гатова.
Пэўна, будзеш невымоўна рад?
Для цябе прыдумала я слова,
Толькі дзе ты?
Мо' пашоў у сад?
Ці з другой жартуеш пры народзе?
Жаліцца я стану сюзане.
Я не знаю дзе ты,
бо прыходзіў
І нявестай зваў мяне...
У сне!

*) Сюзана — насценны кавёр. Паводле старога узбекскага звычаю нявеста пачынала вышываць сюзану за паўтара года да вяселля.

Узбекістан — Мінск, 1939-40 г.г.

Гарбач — вобраз вельмі арыгінальны і цікавы. Гэта ён па сутнасці фармуліруе асноўную ідэю рамана, у ім яна часткова і ўвасоблена.

Чалавек павінен рабіць на карысць усім людзям! Развінай, чалавеча, плечы, не хавай ад другога свайго погляду, глядзі проста перад сабой! За гэта і змагаецца ўсімі сваімі сіламі Гарбач.

Каханне Гарбача і Харошкі авеяна дымкай ідэальна-сантыментальнага. Харошка паўстае перад намі прыгожай, з вельмі чулай і далікатнай душой, але больш рэальнага ўвасаблення гэтага вобраза мы ў рамане не знаходзім.

За што яна пакахала моцнага духам, але фізічна калеку — Гарбача?

За ясны розум, за погляд, накіраваны ў будучыню. І хоць у гэтым каханні шмат невыразнага, дадзенага толькі намёкамі, ...ытач, якому ўжо крыху прыелася каханне па схеме, дзе ён і яна абавязкова пры...жыя і стройныя фізкультурнікі, прымае ...ту сітуацыю з удзячнасцю.

Мурашка цікава раскрывае ўнутраны духоўны стан Гарбача, яго дапытлівую думку, здольнасць глыбока адчуваць з'явы прыроды і жыцця. Асабліва моцна раскрыт душэўны свет Гарбача ў раздзеле «Смага».

Гаворачы аб Гарбачу, нельга аднак не ўказаць, што ў яго асобе вобраз станоўчага героя не зусім удаўся аўтару. У Гарбача шмат злосці і нянавісці супроць кулакоў, жулікаў і прахадзімцаў, але мала мэтазгоднасці ў паступках і ўчынках. Гарбач залішне прасталінейна дзейнічае і таму яго дзеянні часта не дасягаюць поспеху. Затым Гарбач не ўмее аб'яднаць вакол сябе людзей, можа нават з прычыны сваёй залішняй сухасці.

Адсутнасць яркага вобраза большэвіка ...рамане Мурашкі, такога большэвіка, які ...бы аб'яднаць вакол сябе калгасныя ... узняць іх на барацьбу з кулакамі ...можнікамі — адна з самых вялі... рамана. Зусім няправільна аўтар ...кратара парт'ячэйкі Віктара ...таршыню сельсовета Масько, ...услівага абывателя, а дру...алага і бязвольнага чала...-жа палітаддзела Грушэў... загадзя накіроўваюцца аўтарам з Палікараўкі — адзін у Мінск, а другая ў вёску Дубнякі, з прычыны чаго і не могуць зрабіць што-небудзь карыснае ў Палікараўцы. Гэта яшчэ больш падкрэслівае асноўную хібу рамана — адсутнасць моцнага поўнакроўнага вобраза большэвіка.

Кулакам Мысліцкаму і Храпавіцкаму аддаецца ў рамане «Салаўі святога Палікара» найбольшая ўвага.

Мысліцкі і Храпавіцкі — гэта як-бы два бакі адной і той-жа сутнасці.

Першы з далікатным кіёчкам, з прэтэнзіямі на шляхецкае паходжанне, усё вышуквае сваё прозвішча ў «Залатой кнізе шляхты польскай», якую ён забраў у свайго прыяцеля ў часе раскулачвання. Адначасова Мысліцкі беражэ вексялі, пад якія некалі выдаваў грошы. Храпавіцкага, свайго класавага брата, ён не любіць за тое, што той «мужыкаваты». Сам Мысліцкі нават называе яго не Храпавіцкі, а Хрэнпавіцкі, — так далікатней. Кулак Мысліцкі не пазбаўлен аднак і пэўнай «чуласці» да прыроды:

«Свішча недзе ў вышыні лесу салавей і ледзь чутны даходзіць яго голас. «Божа, якая дабрыня», — думае, прыслухоўваючыся, Мысліцкі. — «А людзі вось ніжуцца, а людзі рэжуць адзін аднаго. Чаго гэтым людзям трэба». Ён глядзіць на Храпавіцкага. Той пра нешта думае, сціснуўшы вусны, і вусы натапырыліся, як у ката. З вушэй у яго тырчаць пучкі рыжых валасоў. «Не чуе ён гэтае дабрыні, пане-браце мой, не чуе. Нават вушы пазарасталі шэрсцю. Мужыкаваты ты, пане Хрэнпавіцкі, мужыкаваты, не можаш пачуць гэтае дабрыні».

У гэтых словах вельмі яркая і дасціпная характарыстыка кулакоў.

Мова кулакоў ва ўсім рамане таксама стылізавана пад мужыцка-шляхецкую. Яны гавораць: песяньціна, дзірахціва і г. д.

Залішне дэталізуе Мурашка паступкі кулакоў. Доўга апісваецца, як адзін з іх, Мысліцкі, есць, затым як яго вырывае, як яму моташна пасля папойкі.

Скарачэнне рамана за лік апісання папоек не пашкодзіла-б твору.

Гэта ўсё, безумоўна, натуралізм, які павінен пазбягацца Мурашкам у яго далейшых творах.

Па-другое, вобразы гэтых кулакоў — не новыя для беларускай літаратуры. Мы іх сустракаем, толькі ў больш цікавай інтэрпрэтацыі, у п'есе Кузьмы Чорнага «Бацькаўшчына» пад прозвішчамі Мазавецкага і Сурвілы. Мы іх таксама сустракаем у рамане «На чырвоных лядах» Лынькова пад прозвішчамі Цыбала і Мялава.

Затое цікавымі фарбамі намалявана ў рамане сельсовецкае начальства: Антось Салавей, фельчар Хамовіч, Пунктовіч Тут аўтар не спыняецца на пазіцыях рэалістычнага, або груба-бытавога партрэта, як пры паказе Мысліцкага і Храпавіцкага, — ён дзейнічае гратэскавымі фарбамі і дасягае вялікай выразнасці.

У сюжэтных і кампазіцыйных адносінах раман «Салаўі святога Палікара» найбольш просты з усіх твораў Рыгора Мурашкі. У рамане даецца храналагічнае апісанне падзей у калгасе «Новая справа», звязаных, галоўным чынам, з паходам групы кулакоў, што прабралася ў сельсовет і калгас, супроць калгасніка Якіма Анішчыка. Уся дзея адбываецца бадай у адной вёсцы, зрэдку аўтар дазваляе сабе адступленні ад сюжэта ў выглядзе ўспаміну. Так, праз успамін даецца першая сутычка Яніны з Анішчыкам за колькі год да падзей, што адбываюцца ў рамане, праз успамін мелькам паказваецца маленства Харошкі.

Аднак, гэты просты сюжэт, у якім мяжуюцца апісанні перажыванняў Анішчыка, Яніны, Гарбача з паказам папоек у кулакоў, жніва ў калгасе, — ускладняецца момантамі, што да падзей у рамане ніякіх адносін не маюць. Яны — вынік былога захаплення Мурашкі прыгодніцка-авантурнымі сітуацыямі.

Па-першае, у пачатку рамана даецца нам даволі схематычна намаляваны старшыня РКК Амбражэвіч, для таго каб ён паявіўся ў тых-жа схематычных абрысах на апошняй старонцы рамана. З першых-жа старонак аўтар знаёміць нас з такім-жа схематычным, як Амбражэвіч, начальнікам палітаддзела Грушэўскім. І ўсё для таго, каб к канцу твора мы даведаліся пра на дзіва таямнічую гісторыю, што Грушэўскі прапаваў побач з інструктарам райкома комсамола Харошкай і не ведаў, што гэта яго родная пляменніца.

Мы разумеем аўтара: адчуваючы, відаць, што сюжэт яго рамана не даволі яркі і займальны, ён хацеў запоўніць гэты прабел некаторым налётам таямнічасці, якою ён агортвае асобныя эпізоды і персанажы ў творы.

Але, нам здаецца, што ад адсутнасці гэтай таямнічасці раман значна-б выйграў. Бо, калі збавязковы для сюжэта закон, што павешаная ў пачатку дзеі стрэльба павінна ў апошняй выстраліць, дык у гэтым выпадку стрэлы адбываюцца, але стрэльбу аўтар забыўся павесіць. Вельмі ўжо мізэрныя зацэпкі ў рамане для згаданых вышэй канфліктаў.

З пункту гледжання сюжэта нельга лічыць удалымі завяршаючыя старонкі кнігі. Уласна кажучы, у канцы рамана дзея толькі пачынаецца. Нам, канешне, трэба ведаць лёс Яніны, нам трэба ведаць далей гісторыю Гарбача і Харошкі, бо толькі ў канцы рамана пачынаецца іх жыццё, нам цікава, як яны ў далейшым будуць разумець адзін аднаго. Чытачу таксама трэба ведаць, як банда кулакоў трымала сябе тады, калі прабіла іх дванаццатая гадзіна. Зразумела, тут цікава іх псіхалагічнае становішча, а не фізічны стан.

У стылёвых адносінах раман «Салаўі святога Палікара» не вытрыман цалкам у рэалістычнай манеры, — у ім часта ў вельмі дзіўнай форме пераплятаецца натуралізм з рамантызмам і, нават, крайнім сантыменталізмам.

На моманты натуралізма ў рамане мы паказвалі ўжо. У карціне-ж, дзе расказваецца легенда аб святым Палікары, ёсць найярчэйшае перапляценне натуралізма з сантыменталізмам:

«Бачыць ён, перад будкаю ў лахманах з кары, што прыкрывалі яго голыя плечы і грудзі, страшны як вар'ят, увесь у брудных валасах чалавек сядзіць. Сядзіць гой чалавек сабе, вымае з свае шэрсці казюлькі, лускае іх на кіпці ды нешта мармыча сабе ціха».

«Спужаўся наш чалавек ды хацеў ужо ўцякаць скарэй, але ось заспяваў гэта ўгары салавей, а яго спеву падцягнулі яшчэ салаўі. Тады чалавек пакінуў сваю агідную работу, узняў дагары твар і так сама заспяваў. Наш чалавек аж устыў там, дзе стаяў».

Саладкавыя спевы салаўя, з такім жахлівым брудам, сапраўды дзіўнае спалучэнне!

Сантыменталізм адчуваецца і пры маляванні вобраза Харошкі.

«Яе вусны — маладая краска. Яе шчокі — дзве ружы. Яе валасы... яна ўся— букет пышных вясновых красак. Маладая краска раскрывае свае пялёсткі — Зоя гаворыць: — Бывай!»

Гарбач вельмі натхнёна піша пра «чорныя» астры. І сам аўтар, здаецца, усур'ёз, як за рамантычнае натхненне, прымае аперэтачныя матывы з «Роз-Мары».

Так, побач з асноўнай рэалістычнай манерай рамана, у яго ўладарна ўваходзяць звычныя для ранейшай творчасці Рыгора Мурашкі сантыментальныя настрої і натуралізм.

Гэта адлюстравалася часткова і на слоўных вобразах і на мове рамана.

Побач з некаторай «изысканностью» ў вобразах, Мурашка ўжывае шмат слоў архаічных, або такіх, якія зразумелы толькі людзям, што гавораць слуцкім дыялектам. Вось некаторыя прыклады: «жыве як падарэка»; «не трэба высцігацца»; «цямяцца абрысы маладога лесу»; «стрыгала зубы на Яніну»; «нелапога яшчэ ў яго ад загатовак асталося»; «даць адхланак яе бурлівым думкам»; «замуліла вусны»; «вытахчаная ламачам»; «бэцькоўскі рупесак»; «грэйма, аберуч»; «ты настаўнік блышыш»; «пізуюты чысты блакітны шоўк»; «шыхоўны натоўп», «хітрашч» і г. д.

Побач з ужываннем гэтых малазразумелых, абмежаваных вёскай слоў, Мурашка аднак дазваляе сабе вобразы «изысканные», падсалоджаныя той-жа сантыментальнасцю:

«Але па тым-жа часе, як занавес у тэатры, узняліся вейкі і на старшыню РКК зірнулі» і г. д.

«Высляпілася далёкае сонца і фарботы мудрэй венецыянскіх выткаліся на гразкай грэблі».

«Павольна ідзе па зямлі, распусціўшы чорныя косы, ноч і іскрачкі-зоры зіхцяць у густых яе валасах».

І, нарэшце, найбольш «изысканный» вобраз, які граніччыць ужо з паэтычным уяўленнем аб рэчах, але зразумелым па-сантыментальнаму:

«Грудзі, быццам тыя два спелыя вялізныя яблыкі, схаваныя пад блюзку ад пільнага вока садоўніка, ды не схаваць іх... ...Эх, запыніць цябе, Яніна, садоўнік, не крадзь налўных яблык з яго саду...».

У гэтым імкненні, з аднаго боку да пэўнай архаічнасці ў мове, а з другога— да вычурнасці і «изысканности» ў вобразе, мы ізноў бачым спалучэнне элементаў натуралізма з крайнім сантыменталізмам.

Можна было-б паказаць яшчэ больш шырока праявы сантыменталізма і ў пейзажах Мурашкі.

**

Мы падрабязна прааналізавалі як дадатныя бакі, так і недахопы, правалы ў рамане Рыгора Мурашкі «Салаўі святога Палікара» не для таго, каб падлічыць у процантах суадносіны дадатнага і адмоўнага. Мастацкая каштоўнасць твора не заўсёды механічна раўняецца колькасці адмоўных і станоўчых элементаў у ім. Бо такое, на першы погляд, парадаксальнае сцвярджэнне будзе безумоўна правільным у дачыненні да мастацкага твора: добры твор не стане благім, хоць будзе мець вялікія недахопы, а, з другога боку, дрэнны твор, хоць будзе мець і «дахопы», — ніколі не стане добрым.

Тут справа значна складаней.

Мы падрабязна апісалі ўсе, нават дробныя, хібы рамана Мурашкі для таго, каб аказаць пасільную дапамогу аўтару ў яго далейшай творчай рабоце. Што да вывадаў з артыкула, дык мастацкая поўнацэннасць такіх вобразаў рамана, як Яніна, Анішчык і часткова Гарбач, з'яўляецца вырашальным момантам для станоўчай ацэнкі твора, наколькі гэтыя вобразы ўвасабляюць ідэю рамана.

Творчасць Мурашкі займае асаблівае месца ў нашай літаратуры. Яго празаічныя творы прадстаўляюць значную з'яву, не глядзячы на іх спецыфічныя хібы, ужо таму, што пісьменнік не паўтарае стыль другіх нашых празаікаў, а застаецца арыгінальным і самабытным. У Мурашкі свой погляд на рэчаіснасць, свая, некальκі паэтычная, творчая манера, бліскучае веданне народнага жыцця, быта, разуменне мовы.

І, галоўнае — чэснасць і прамата сапраўднага мастака.

ПАТУРАННЕ ПРАГУЛЬШЧЫКАМ

У Тэатры юнага гледача БССР, які цяпер знаходзіцца на гастролях у Брэсце, павінна была адбыцца рэпетыцыя аркестра па падрыхтоўцы канцэрта, прысвечанага першай гадавіне вызвалення Заходняй Беларусі.

А 12 гадзіне дня, калі была прызначана рэпетыцыя, з'явіліся аркестранты. Было абвешчана, што аркестр павінен падрыхтаваць песні Дунаеўскага, Блантэра і іншых совецкіх кампазітараў для праграмы канцэрта. І вось музыканты Кулікаў, Гофман, Асновіч, Адліванкін адмовіліся рэпетыраваць. Чым яны тлумачылі гэта? Гофман наогул адмовіўся іграць «джазаўскія песні», спасылаючыся на тое, што ён — аркестрант драматычнага тэатра, а не «джаза» (дарэчы, увечары гэтага-ж дня музыканты Гофман і Кулікаў патрабавалі дадатковай аплаты за выступленне ў тым-жа рэпертуары, але мясцком адмовіў ім у абароне «гэтых правоў» на падставе загада Усесаюзнага Камітэта па справах мастацтваў). Адліванкін і Асновіч «растлумачылі», што студэнтам кансерваторыі «нельга іграць джазавыя песні».

Рэпетыцыя была абвешчана. Прайшло 15, нарэшце 20 і 45 мінут і ўсякія просьбы дырыжора Белкіна не мелі поспеху. Аркестранты, падбухтораныя Гофманам, Кулікавым, Асновічам, Адліванкіным, маўчалі... Так была сарвана 4-х гадзінная рэпетыцыя ўсяго склада аркестра.

Гэтым злосным парушэннем Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР рвачамі-музыкантамі быў абураны ўвесь калектыў. Сход калектыва тэатра патрабаваў перадачы справы ў народны суд. І гэтая справа была перадана ў брэсцкую абласную пракуратуру.

Але суд над прагульшчыкамі, парушальнікамі Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, дэзарганізатарамі працы... не адбыўся. Пракуратура гор. Брэста палічыла гэта «дробнай справай», абмежавалася выклікам прагульшчыкаў і дачай ім «таварыскіх заўваг», прапанаваўшы дырэкцыі тэатра рэагіраваць на гэту справу «ў рабочым парадку». Урэшце дырэктар тэатра тав. Медрыш скасаваў першы загад аб перадачы справы ў суд і вымушан быў абмежавацца вынясеннем... вымовы.

Гэты абураючы выпадак патурання прагульшчыкам выклікаў нездаровыя настроі ва ўсім калектыве, якія цяпер праяўляюцца ў адмаўленні асобных членаў калектыва, па прыкладу вышэй згаданых аркестрантаў, ад удзелу ў праграме канцэрта.

Так укрыліся дэзарганізатары працы, злосныя прагульшчыкі пад апякунствам брэсцкай пракуратуры.

БРЭСТ. **(Наш карэспандэнт).**

Ад рэдакцыі: Чакаем ад Пракуратуры БССР тэрміновага разгляду гэтай справы і патрэбнага рэагіравання на яе.

Першыя крокі перабудовы

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня адкрыў выдатныя магчымасці для ўздыму прадукцыйнасці работы тэатральных калектываў.

Выпаўненне Указа забяспечвае новыя поспехі творчай работы тэатраў.

Прывядзём, як довад гэтага, некалькі прыкладаў з практыкі работы Дзяржаўнага рускага тэатра БССР.

У тэатры ўведзен дакладна распрацаваны графік яўкі і ўхода з работы, поўнай васьмігадзіннай загрузкі кожнага работніка тэатра. Мастацка-акторскі цэх, які раней рэпетыраваў толькі дзве гадзіны і 4 гадзіны быў заняты ў спектаклі, цяпер мае 4—5 рэпетыцыйных гадзін, а астатні час заняты ў спектаклі. Акторы, не занятыя ў бягучым рэпертуары, рэпетыруюць і ўвечары, у часе спектакля. Інспектура сцэны вядзе дакладны ўлік колькасці і якасці работы кожнага работніка.

Пры новым уліку выпаўнення кожным работнікам нормы рабочага часу высветлілася, што паасобныя артысты не загружаны. Для ліквідацыі гэтага намечана выкарыстанне артыстаў у падрыхтоўцы новых канцэртных праграм і творчай вучобе.

Работа па-новаму дала магчымасць скараціць лік актораў і адміністрацыйна-упраўленчы апарат на 4 адзінкі.

Выпаўненне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР дае магчымасць выпускаць спектаклі значна раней вызначаных тэрмінаў і лепшыя па якасці.

І. ПРАЎДЗІН.

ПЕРСПЕКТЫВЫ НОВАГА СЕЗОНА

Дэкада беларускага мастацтва, якая з вялікім поспехам прайшла ў Маскве і атрымала высокую ацэнку партыі і ўрада СССР, з'яўляецца выдатным этапам у жыцці нашага тэатра, прайшоўшага вялікі творчы шлях. Маскоўская прэса, адзначаючы вялікія дасягненні ў рабоце нашага тэатра па пастаноўцы беларускіх твораў, указала і на рад істотных недахопаў.

Аддаючы належнае таленавітасці нашых беларускіх кампазітараў, трэба адзначыць, што яшчэ не ўсе яны авалодалі майстэрствам аркестроўкі, веданнем вакала і паліфанічнай тэхнікай. Не заўсёды на адпаведнай вышыні харавая фактура і рэчытатывы. Гэтыя недахопы лёгка знішчыць пры ўмове вялікай напружанай работы кампазітараў і павышэнні патрабаванняў тэатра да кампазітараў і лібрэтыстаў.

Павышэнне якасці музычнай творчай прадукцыі павінна стаць асноўнай задачай нашай музыкальнай работы.

Мы не можам рабіць больш скідак на лібрэта і музыку новых твораў і наш абавязак не толькі дапамагаць аўтарам у стварэнні новых спектакляў, але і прад'яўляць больш павышаныя патрабаванні да аўтароў.

У святле гэтых патрабаванняў нам трэба падыходзіць да пастаноўкі двух новых арыгінальных твораў, якія ўключаны у рэпертуар тэатра — гэта опера кампазітара Шчэглова «Кацярына» і балет кампазітара Кабалеўскага «Залатыя каласы».

Апрача двух новых беларускіх пастановак і аднаўлення пастановак, якія ішлі ў мінулым сезоне, тэатр рыхтуе да паказу мінскаму гледачу наступныя музычныя спектаклі: оперы «Пікавая дама» Чайкоўскага, «Чыо-Чыо-сан» Пучыні, «Травіята» Вердзі, «Казкі Гофмана» Офенбаха, балеты: «Лебядзінае возера» Чайкоўскага, «Дон-Кіхот» Мінкуса.


Такім чынам, наш тэатр пакажа ў 1940—41 годзе восем новых пастановак.

Для маладога тэатра, якім з'яўляецца наш оперны тэатр, падрыхтоўка такога вялікага рэпертуара з'яўляецца задачай вельмі складанай, але зусім выпаўнімай, улічваючы павелічэнне рабочага дня, умацаванне працоўнай дысцыпліны і ўсю перабудову работы на аснове выпаўнення Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня.

Адкрыццё сезона намечана 1 верасня операй заслужанага дзеяча мастацтваў БССР кампазітара-ордэнаносца А. Туранкова «Кветка шчасця». Пасля пойдуць оперы «Міхась Падгорны», «У пушчах Палесся» і балет «Салавей».

11 верасня намечана к выпуску опера Пучыні «Чыо-Чыо-сан» у пастаноўцы рэжысёра-ордэнаносца, заслужанага артыста БССР П. Златагорава.

Н. ГРУБІН,
заслужаны дзеяч мастацтваў, галоўны дырыжор Дзяржаўнага ордэна Леніна Тэатра оперы і балета БССР.



Па гарадах Совецкай Беларусі. **На здымку:** гарадскі драматычны тэатр у Беластоку (від з самалёта).

ТВОРЧЫ АГЛЯД ТЭАТРАЛЬНАЙ МОЛАДЗІ

У мэтах стымуліравання роста акторскай моладзі, вылучэння найбольш таленавітых маладых работнікаў тэатра і мабілізацыі шырокай грамадскай думкі вакол пытанняў падрыхтоўкі тэатральнай змены, паводле загада Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР, у другім паўгоддзі 1939 года была разгорнута ва ўсіх тэатрах БССР падрыхтоўка да агляду творчай моладзі. Аднак, падрыхтоўчая работа не была праведзена з такой увагай і ў такіх тэмпах, якіх трэба было чакаць. Трэба адзначыць, што сэнс і форма правядзення агляду творчай моладзі былі спачатку не ясны для нядаўна створаных маладзёжных калектываў, як Рускі дзяржаўны тэатр БССР, Гомельскі абласны, Беларускі ТЮГ і некаторыя калгасныя і соўгасныя тэатры, дзе моладзь занята работай на першых ролях.

Дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Беларускі драматычны тэатр правёў рэпетыцыйную работу над двума спектаклямі ў маладзёжным складзе: «Не было ні гроша, ды раптам алтын» Астроўскага ў пастаноўцы засл. арт. БССР Л. Г. Рахленка і «Дура для другіх, разумная для сябе» Лопе дэ-Вега ў пастаноўцы засл. арт. БССР В. Я. Галаўчынера.

Акторска гэтыя спектаклі амаль гатовы і іх выпуск павінен адбыцца ў бліжэйшы час.

Найбольш эфектыўна праведзен агляд моладзі ў Віцебскім дзяржаўным драматычным тэатры і ў Гомельскім рускім абласным драмтэатры.

У Віцебскім беларускім драмтэатры агляд праводзіўся з лістапада па снежань 1939 года. У парадку агляда былі паказаны з удзелам моладзі спектаклі «Генеральны консул», «Чалавек с ружжом».

З агульнай колькасці ўдзельнікаў агляду аглядавая камісія адзначыла наступных маладых актораў тэатра: Шэлег (Гоглідзе — «Генконсул») Моўзон (Сато — «Генконсул»), Казлоў (Княжыцкі — «Генконсул»), Заранак (Надзя — «Чалавек з ружжом»), Трус (Дымаў — «Чалавек с ружжом») і пастаноўшчыка спектакля «Генконсул» маладога рэжысёра Іванова.

У Полацкім калгасным тэатры да агляду падрыхтаван спектакль «Не ўсё кату масленіца».

У Гомельскім абласным тэатры агляд таксама праведзен. Падрыхтоўка дублёраў тут вялася з другой паловы сезона.

Спецыфіка гэтага тэатра (ён цалкам маладзёжны) высунула, як асноўны прынцып агляду, апрабіраванне ў адказных ролях актораў, якія прышлі ў тэатр ў парадку папаўнення састава, выпускнікоў Маскоўскага тэатральнага інстытута і паказа маладых актораў класа Леанідава ў новых ролях. Але не ўсе маладзёжныя рэсурсы былі выкарыстаны. Тры чалавекі з дапаможнага састава, якія маюць усе падставы ўключыцца ў гэты агляд, не былі прагледжаны.

Многія акторы намецілі для агляду ролі, не ўласцівыя іх індывідуальнасці, а таму выступленне на аглядавых спектаклях было малакарысным для іх. У аглядзе прымалі ўдзел 28 чалавек, з іх пяць маладых актораў упершыню атрымалі ролі, дванцаць актораў атрымалі ролі па дублёрству.

Агляд быў праведзен з 20 па 30 красавіка. Паказаны былі спектаклі «Рэвізор» — Гогаля, «Падзь Сярэбраная» — Пагодзіна, «Хто смяецца апошнім» — Крапівы, «Чайка» — Чэхава.

Вельмі станоўчым і цікавым вопытам было правядзенне маладзёжнай канферэнцыі гледачоў, у якой прымалі ўдзел комсамольскія арганізацыі горада, студэнцтва, вучні старэйшых класаў школ.

Абласная камісія адзначыла вялікую ролю маладых вядучых актораў гэтага тэатра — Персціна (роля Бобчынскага, Такедо, Тулягі), Кудзелінай (Гарлахвацкая, Аркадзіна), Раманавай (Ніна), Рукавіцына (Трэплеў), Маслава (Зёлкін, Земляніка).

3 актораў, упершыню атрымаўшых ролі, на аглядзе выявіліся, як найбольш здаровыя, Дземідава, Русакова, Астравумаў, Маляроўскі і інш.

Тэатр мае намер выкарыстаць у далейшай рабоце найбольш здольных маладых актораў па адказных ролях у будучых спектаклях.

Абласныя тэатры Пінска і Баранавіч усё другое паўгоддзе 1939 года раз'язджалі па Заходняй Беларусі, абслугоўваючы працоўных гэтых абласцей. І толькі цяпер тэатры прыступяць да падрыхтоўкі агляду творчай моладзі. Аглядавыя спектаклі будуць выпушчаны ў пачатку надыходзячага сезона.

У Рэчыцкім калгасным тэатры агляд быў праведзен у сакавіку гэтага года. Былі паказаны два спектаклі «Без віны вінаватыя» А. Астроўскага, «Павел Грэкаў» Ленча і Войцэхава. Аглядавая камісія выявіла рад недахопаў у падрыхтоўцы, бо большасць маладых актораў была паказана не ў першых, а ў другарадных ролях. Улічваючы гэта, Рэчыцкі калгасны тэатр правёў у чэрвені паўторны агляд творчай моладзі свайго тэатра.

На паўторным аглядзе тэатр паказаў спектакль «Сады цвітуць» Масса і Кулічэнкі. У аглядзе прымала ўдзел 10 маладых актораў. Абласная камісія адзначыла наступных удзельнікаў агляду: Огіенка ў ролі Карпа Іванавіча, Гадчыеўскую (Вера), Высоцкага (Свярчок), Рабанаву (Таня), Нікуліна (Пётр).

Становішча агляду моладзі ў тэатрах БССР прымушае павялічыць яго тэрміны, бо завяршэнне агляду цяпер, калі ён закончан толькі некалькімі тэатрамі, было-б заўчасным.

Вынікі рэспубліканскага агляду творчай моладзі прадстаіць падвесці ў канцы 1940 года.

К. ВІЛЕНСКІ.

У БЕЛАСТОЦКІМ КЛУБЕ ПІСЬМЕННІКАЎ

У сувязі з падрыхтоўкай да першай гадавіны вызвалення Заходняй Беларусі ў беластоцкім клубе пісьменнікаў пачалася ажыўленая творчая работа. Совет клуба, у складзе пісьменнікаў Кагаюўскага, Сфарда, Шэйнберга, сумесна с Аргбюро ССПБ праводзяць чыткі і абмеркаванне новых твораў, наладжваюць творчыя вечары пісьменнікаў.

10 жніўня пісьменнік Д. Міцмахер прачытаў сваю новую камедыю «Налеўкі». Абменьваючыся ўражаннямі і думкамі, пісьменнікі Бурштын, Сфард, Марк адзначылі багатую мову твора, указалі разам з гэтым на марудпасць дзеі, на неакрэсленасць дзеючых асоб.

13 жніўня адбыўся творчы вечар совецкага яўрэйскага пісьменніка Уры Фінкеля. Беластоцкія пісьменнікі цёпла прынялі аўтара белетрызаваных біяграфій класікаў яўрэйскай літаратуры Мендэлэ Мойхер Сфорыма і Шолам-Алэйхема. Многія с выступаўшых адзначылі, што не гледзячы на вялікую складанасць матэрыяла, пісьменнік стварыў кнігі, якія чытаюцца з цікавасцю.

Уры Фінкель падзяліўся вопытам сваёй даследчай работы, расказаў, як ён працаваў над аповесцямі.

16 жніўня тав. Фінкель прачытаў для пісьменнікаў даклад аб заснавальніку яўрэйскага тэатра драматургу Гольдфадэну.

Жывую зацікаўленасць выклікала ў пісьменнікаў арганізаваная 20 жніўня чытка новых навел маладой польскай пісьменніцы Г. Дабжынскай.

Выступаўшыя ў абмеркаванні таварышы Бранеўская, Каганоўскі, Смоляр, Сфард, Марк і Дэгаль адзначылі, што ў прачытаных Дабжынскай навелах «Граніца», «Янова», «Яблыкі і лялька» адчуваюцца сапраўдныя якасці пісьменніка — пачуццё меры, выразнасць, мастацкая пераканаўчасць вобразаў, маляўнічасць. Разам з гэтым яны крытыкавалі няўменне канкрэтызіраваць тэму.

У бліжэйшыя дні будзе праведзен творчы вечар яўрэйскага паэта І. Эміота, чытка крытычнага нарыса аб Бергельсоне Б. Марка, сустрэча з калектывам польскага тэатра і абмеркаванне яго новых спектакляў.

У клубе арганізоўваецца гурток па вывучэнню рускай мовы, пачынае выходзіць насценная газета.

Рыва ДРЭЕР.

„Казка" М. Святлова ў Тэатры юнага гледача БССР

17 жніўня калектыў Тэатра юнага гледача БССР паказаў сваю новую прэм'еру «Казку» М. Святлова ў перакладзе Р. Лынькова працоўным Брэста (пастаноўка мастацкага кіраўніка М. М. Сухарава, мастак А. З. Брыклін, кампазітар Е. П. Каменаградскі).

Юныя і дарослыя гледачы гор. Брэста вельмі цёпла прынялі новы спектакль тэатра аб дружбе, марах, любві і гераізме патрыётаў нашай радзімы. Цікавыя запамінаючыяся вобразы ў спектаклі стварылі акторы: Н. Канакова (Таня), С. Гурвіч (Шурык), Л. Будзько (Іван Анісімавіч), А. Матусевіч (Майсей), Н. Навіцкі (старык), С. Патаповіч (Кульгавы), В. Ігнацьеў (Віктар), П. Ротэр (Каця), В. Чэмелаў (Ваня) і інш.

Пасля гастролей у заходніх абласцях БССР у другой палове верасня тэатр пакажа гэты спектакль юным гледачам Мінска.

Пісьмы ў рэдакцыю

АБ ДОБРАЙ ІНІЦЫЯТЫВЕ І РОЎНАДУШНЫХ ДЗЯЛЬЦАХ

Х. А. Саломенскага — дырэктара кінотэатра імя Леніна ў раённым цэнтры Гарадку добра ведаюць і паважаюць мясцовыя жыхары. Паважаюць за добрасумленную работу, за ініцыятыву.

За параўнаўча кароткі час у кіно імя Леніна праведзен рад цікавых мерапрыемстваў.

Вось адно з іх. У Гарадок была прыслана карціна «Вялікі грамадзянін». Восем дакладаў на асобныя тэмы па гісторыі ВКП(б) праслухалі ў сувязі з карцінай гледачы.

У гэтыя дні Саломенскі ўшчэнт разбіў «прадзельчаскія» тэорыі: карціна замест звычайнай нормы дэманстрацыі — 1—2 дні, ішла ў Гарадку пры поўным зборы 6 дзён.

Улетку 1939 года кіно па ініцыятыве Саломенскага ператварылася ў... тэатр. У ім далі свае спектаклі Тамбоўскі тэатр драмы, Жытомірскі яўрэйскі, асобныя ансамблі. Жыхары Гарадка, навакольных калгасаў засталіся вельмі задаволенымі. «Анна Карэніна», «Разлом» і іншыя спектаклі былі прагледжаны з вялікай цікавасцю.

Цяпер з поспехам іграе сабраны з мясцовых жыхароў невялікі, камернага характару, аркестр.

***

Працоўныя Гарадка, раённыя арганізацыі моцна падтрымліваюць Саломенскага ва ўсіх яго пачынаннях. Як актыўнага грамадскага работніка, выбаршчыкі ўшанавалі яго сваім давер'ем — Саломенскі з снежня 1939 года з'яўляецца дэпутатам мясцовага Совета дэпутатаў працоўных.

Але калі ў раёне паяўляецца чуласць да работніка, дык не можа пахваліцца асаблівай увагай да Саломенскага, былога кіномеханіка, а цяпер дырэктара, які бяззменна працуе ў кіно каля 15 год, — абласны трэст кінофікацыі.

Кіраўнікі трэста забаранілі Саломенскаму запрашаць у Гарадок якія-небудзь драмкалектывы.

— Аркестр музыкі? Спыніць! Сродкі на гэта даваць не будзем, — заяўляюць Саломенскаму трэстаўскія заправілы.

— Пашырыць файе? Няма сродкаў, — і па-ранейшаму цесняцца гледачы ў маленькім памяшканні.

Абыякавыя адносіны кіраўнікоў трэста да работы Гарадоцкага кіно поўнасцю адпавядаюць такім-жа бяздушным адносінам да самога Саломенскага.

І. РУБІНШТЭЙН.

УПАРАДКАВАЦЬ ПЛАНІРАВАННЕ ГАСТРОЛЕЙ

Штогод абласныя аддзелы мастацтваў атрымліваюць з Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР планы работ гастраліруючых тэатраў. У планах паказаны тэрміны работы і назвы тэатраў.

Магілеўскі абласны аддзел мастацтваў таксама атрымаў з Упраўлення па справах мастацтваў план работы тэатраў. У гэтым плане чэрвень і жнівень паказаны прагульнымі, пустымі. Мала таго, калі па плану ў ліпені павінны былі быць гастролі Віцебскага тэатра, дык і гэтага не адбылося, Віцебскі тэатр не быў на гастролях у Магілеве. На працягу трох месяцаў гарадскі тэатр у Магілеве пустуе. Калі да гэтага дадаць, што асенні сезон у тэатры замест 1 жніўня пачнецца не раней 1 кастрычніка, будзе зразумелым становішча, у якое трапіў магілеўскі глядач дзякуючы такому «планіраванню» Упраўлення.

Яшчэ горш абстаіць справа з Бабруйскім гарадскім тэатрам. А гэта-ж тэатр вялікі — на 1.200 месц. У планіраванне і мінулага і сучаснага года тэатр амаль не ўваходзіць. Таму дырэкцыя прымушана была сама падшукваць тэатры, калектывы, канцэрты, ансамблі для таго, каб так-сяк працаваў тэатр. Можна сабе ўявіць, колькі каштуе Бабруйскаму тэатру такое «планіраванне», калі даведаемся, што кожны дзень прастоя абыходзіцца яму ў 700 рублёў, а Магілеўскаму тэатру — у 400 рублёў.

Дазволім сабе прапанаваць на наступны час выхад з гэтага становішча: за зімовы перыяд абласныя аддзелы, улічваючы паступаючыя з месц запросы, а таксама маючы на ўвазе працаваўшыя з поспехам калектывы, павінны самі складаць арыентыровачны план гастролей і накіроўваць яго ў Упраўленне па справах мастацтваў, дзе ўжо можна будзе зрабіць поўны план гастролей. А да канчатковай распрацоўкі гэтага плана трэба таксама прыцягнуць работнікаў мясцовых абласных упраўленняў.

Г. КАЛАТНОВЕР,
старшы інспектар Магілеўскага абласнога аддзела мастацтваў.

Л. А. АБАКУН

Л. А. Абакун адна з першых прышла па закліку ЦК ЛКСМБ ствараць тэат[р] шчаслівага юнацтва Совецкай Беларусі.

Жыццерадаснай шаснаццацігадовай дзяўчынкай яна прышла ў Тэатр юнага гледача БССР з яркай марай аб радаснай творчай працы.

Піонеры і школьнікі помняць звонкі голас актрысы-масавіка Ліды Абакун, якая так часта выступала ў піонерскіх лагерах, а пасля канцэрта развучвала новыя песні, танцы з сваімі любімымі гледачамі. Ні адна паездка ў піонерскія лагеры, ні адна дзіцячая масоўка не праходзіла без яе ўдзелу.

За свой невялікі творчы шлях Ліда Ануфрыеўна Абакун стварыла рад цікавых, запамінаючыхся вобразаў: Мопсю — настаўніцу-выхавальніцу старой гімназі[і] («Блакітнае і ружовае»), Адарку — («Я[к] гартавалася сталь»), хлопчыка Отто — («Дружына») і інш.

Л. А. Абакун не шкадавала сіл [для] сваёй любімай справы — тэатра.

Заўчасная смерць вырвала [з] радоў чулага таварыша і [...] актрысу.

Вл. С[...]

Ів. Сіняўскі

ШАФА

(Апавяданне)

Два годы таму назад Люляй, як і цяпер, працаваў загадчыкам калгаснай фермы. Яму не хацелася ўспамінаць пра той час, але другія помнілі. Помніў, напрыклад, старшыня калгаса Мірон.

Нядаўна, на агульным сходзе калгаснікаў, калі прэміравалі Люляя, Мірон сказаў пра яго:

— Быў час, калі таварыш у нас выпіваў. Сход, ці што другое падзейнічала на яго, але яго паводзіны змяніліся. Мы зараз маем перад сабой другога таварыша. Ён у нас першы чалавек у калгасе...

Жонка Люляя, Настася Сямёнаўна, жанчына ціхая, але з характарам, даведаўшыся аб тым, што яе Люляй лічыцца першым чалавекам у калгасе, рашыла, што цяпер для іх павінны рабіць усё ў першую чаргу—і даваць каня, каб паехаць у госці, і дастаўляць дровы, і... усё, усё.

І вось здарылася так. Калгас проста з завода атрымаў дзесяць, з люстэркам на ўсе дзверцы, шафаў. Ахвотнікаў набыць шафу было так многа, што калі-б задаволіць усіх, то трэба было-б да кожнай з гэтых дзесяці шафаў дакупіць яшчэ па дзесяць. Таму на праўленні калгаса вырашылі шафы выдаць таму, хто апраўдвае сябе на рабоце і хто мае ў гэтым выключную патрэбу. Выдалі шафы конюху Ігнату і трактарысту Юзіку. З астатнімі рашылі пачакаць да канца сяўбы.

Настася Сямёнаўна ўсе свае намаганні цяпер накіравала на шафу.

І з гэтага часу кончыўся спакой Люляя. Кожны абед і вячэру Настася Сямёнаўна заводзіла адну і тую-ж гутарку.

— Першы чалавек у калгасе, а як да справы—то апошні!—Потым гаварыла, што яго не цэняць, забыліся, няма да яго ўвагі.

Люляй не знаходзіў, што адказаць, хоць і ведаў, што жонка пляце глупства.

У мястэчковым раймагу таксама былі шафы. Праўда, яны не мелі люстэркаў на дзверцах, і, каб прывезці шафу, трэба было браць каня ў калгасе, ехаць «за блізкі свет». Але-ж купіць можна было.

Аднойчы Люляй палажыў перад жонкай пачку крэдытак і, як можна асцярожней, сказаў:

— У мястэчку яны бываюць... не горшыя чым гэтыя...—Настася Сямёнаўна не дала яму кончыць:

— Гэта, каб першым быць, ды... Як гэта можна? Ты можа хутка працадні свае ім даруеш?..

— Прычым тут працадні, — стрымана сказаў Люляй і, пачакаўшы, дадаў: — Я прасіць не магу. Знойдуць патрэбным — дадуць.

Люляй быў спакойны, ніколі не лаяўся з жонкай і за ўсё жыццё ні разу не абазваў яе дрэнным словам. Яе крыкі наконт шафы злавалі яго, але ён не паказваў гэтага. Калі-ж Настася Сямёнаўна дагаварылася да таго, што, раз з ім не лічацца, то дарэмна ён стараецца працаваць,—яго ахапіла такая глыбокая крыўда, што ён не стрымаў.

— Маўчала-б, табе ўсё нехапае... І прычапілася-ж...—ускочыўшы з-за стала, закрычаў ён у спалоханы твар Настасі Сямёнаўны.—Сумлення ў цябе няма! Душу атруціла!..

Пасля гэтай непрывычнай успышкі Настася Сямёнаўна прыціхла. Але ў Люляя знік ранейшы спакой. Супроць яго волі стала назойліва лезці ў галаву: «Маглі-б і мне даць. Я-ж працую...» І, узлаваўшыся на сябе за такія думкі, Люляй пляваўся і з стукам зачыняў вароты карэўніка.

Люляй стаў пахмурным і рассеяным. У старшыні калгаса Мірона закраліся падазрэнні. Ці не пачаў выпіваць Люляй? Выяўляць не было калі ў такі гарачы час—вясновая сяўба была ў поўным разгары. І ўсё-ж Мірон часцей стаў наведваць ферму. Люляй часта лавіў на сабе новы, якісьці недаверлівы погляд старшыні. Гэта крыўдзіла яго. Хацелася сказаць: «Ды будзе табе, Мірон. Што я маленькі, ці што?»

Аднаго разу Люляй замыкаў напач хлеў. І тут перад ім, як з зямлі, вырас Мірон.

«Ды будзе табе»...—хацеў было сказаць Люляй, але тут-жа ўспомніў, што каровы сапраўды не былі напоены. Першы раз за два годы так сталася. Ён быстра штурхнуў дзверы. У руках яго ўспыхнуў ліхтар. Каровы, здзіўленыя непрывычным святлом, заварушыліся на свежай саломе. Заблішчэлі дзесяткі вялікіх вачэй-агенькоў. Мільганула гладкая шырокая спіна галандкі. Яна павярнула галаву ў бок ліхтара, прамычала. Яе голас нажом паласнуў Люляя. Гэта-ж па яго віне каровы былі-б суткі няпоенымі...

Пасля работы, калі Люляй разам з Міронам ішлі ў вёску, Мірон асцярожна спытаў:

— Ад чаго гэта з табой? Як гэта ты, таварыш... Скажы на міласць...

Ён прабег недаверлівым поглядам па вялікаму, барадастаму твару Люляя:

— Можа... вярнуўся да ранейшага? Не вытрымаў? Ну, гавары-ж, таварыш...

І такая жаласць з'явілася на яго худым змораным твары, асвечаным ліхтаром, што Люляй не сцярпеў:

— Мірон!—крыкнуў ён.—Як ты мог на мяне так?.. А свой чалавек...

— Яно, таварыш...—нявесела ўсміхнуўся Мірон.—Ну ладна. Добра, калі я памыліўся.

Ноччу Люляй убачыў сон, ад якога прачнуўся ўвесь у халодным поце. Сон быў да таго ясны, што помнілася ўсё да дробязі: заходзіць ён у хлеў, а чорная галандка ляжыць адкінуўшы галаву, і ўжо апошнія духі спускае... Тут-жа Мірон, паварочваючы галаву да Люляя, гаворыць:

— Эх, таварыш... не дагледзеў. На цяленні карова, а ты...

Люляй хапіўся было ўставаць і бегчы ў кароўнік, але, успомніўшы, што галандка ацеліцца не раней як праз тыдзень, ён ціха, каб не прачнулася Настася Сямёнаўна, павярнуўся на другі бок. І тут зноў Люляй хапіўся за сваё: а што калі-б расказаць усё, як ёсць, пра шафу гэтую... Але каму расказаць? Мірону? Мірону і толькі...

Мірон, пэўна, і не заўважаў, што быў для свайго калгасніка самым блізкім чалавекам. Люляй любіў у старшыні і быструю знаходлівасць і скупасць на словы.

У тую-ж раніцу, ідучы на ферму, Люляй яшчэ здалёк заўважыў старшыню і рашыў абавязкова цяпер загаварыць наконт шафы. Але ўбачыўшы худы, заклапочаны твар Мірона, Люляй зразумеў, што ў яго не павернецца язык лезці з дробязнай гутаркай да занятага чалавека.

Неяк у калгаснай канцылярыі, калі там былі Мірон, Ігнат і другія калгаснікі, Люляй не вытрымаў—сказаў, што, моў, працуй—не працуй, а ўвагі табе няма ніякай.

На другі дзень Мірон пазваў да сябе ў кабінет Люляя і шчыльна прычыніў дзверы.

— Так-с, таварыш...—сказаў Мірон, не сядаючы, і чамусьці пераставіў на стале прэс і чарнільніцу.—Я, ведаеш, не ўмею гаварыць многа. Адным словам, таварыш... мне здаецца... мне здаецца, ад цябе сапраўды стала пахнуць? Нельга гэта пры нашай справе, таварыш, зразумей!—з сілай выкрыкнуў ён.

Люляй вінавата глядзеў на старшыню і таропка думаў, што апраўдвацца тут не выходзіць. Няхай лепш Мірон падазрае яго ў выпіўцы. Гэта не страшна таму, што ён не вінават. Толькі-б не здагадаўся ён аб шафе. Прызнацца яму ў гэтым,—гэта ўсёадно, што паказаць на сябе пальцам і сказаць: «Вось чалавек, якога можна купіць за капейку».

— Падумай і зрабі вывады, — заключыў Мірон і ўставіўся на Люляя, чакаючы, каб ён сам рашыў аб сабе.

І раптам старшыня ўбачыў, як суровыя, нібы выструганыя з дрэва, губы Люляя рассунуліся і ў зарасніках рэдкай, але пышнай няголенай барады засвяцілася шчаслівая ўсмешка.

— Хай будзе па-твойму. А там... вось ты ўбачыш сам і пераканаешся. Справа, яна сябе дакажа. Мірон!—сказаў Люляй з той спакойнай упэўненасцю ў сабе, якой ён жыў гэтыя два годы.

... Ужо даўно сонца намагалася прабіцца скрозь ватныя воблакі. І вось яно прарвалася, нарэшце, усімі сваімі гарачымі праменнямі і дрэвы прысадаў на вуліцы радасна зашумелі.

Люляй бег дамоў абедаць. Не даходзячы да свае хаты, ён убачыў, як з двара выйшаў і хутка пакрочыў па вуліцы Мірон. У Люляя трывожна забегалі думкі.

«Чаго-ж ён быў»...

Скрозь плот замільгала на двары жоўтая шафа. З варот выязджаў з драбінкамі, поўнымі мятай саломай, конюх Ігнат.

— Шафа табе, Люляй... Па пастанове праўлення,—казаў Ігнат.—Золата шафа.—Люляй вінавата закашляўся. Ён запрасіў конюха паабедаць, але той спяшаўся адагнаць каня.

Люляй зачыніў за ім вароты.

У люстэрку шафы вясёлкава свяцілася вялікае сонца. Шафа прыемна пахнула фарбамі. Люляй дакрануўся рукой люстэрка і раптам, разам з пякучым сорамам ад таго, што ён турбаваў людзей, яму хлынула ў душу такое вялікае пачуццё чалавечай цеплыні, што да вачэй міжвольна прыліліі слёзы.

У хаце, ля печы, завіхалася Настася Сямёнаўна. Калі ўвайшоў Люляй, хваляванне на яго твары яна прыняла за нездавальненне і скорагаворкай выпаліла:

— Ты можа падумаў, што я сказала? Ён сам выпытаў пра шафу... Хітры ён, Мірон гэты. Надоесь прышоў у хату і пытае: «Скажы, Настася Сямёнаўна, Люляй твой часта п'яным дамоў прыходзіць?» Гэта ён на хітрасць. А я яму, як дурніца тая, і гавару праўду: «Хрысціся, кажу, чалавеча! Два годы, кажу, як я ў яго чаркі не бачыла». Тады ён зноў пытаецца: «Яго можа пакрыўдзіў хто? Гавары ўсё!»—кажа. Ну, я яму і расказала...

Яна часта пазірала праз акно на шафу. Здаволенасць свяцілася ў яе вачах. Чамусьці Люляю яна нагадвала вялікую кошку, якая нешта мурлыча ля печы.

З глыбокім жалем Люляй сказаў:

— Эх, Наста... Людзі кругом змяніліся, а ты ўсё тая-ж. Табе толькі-б аб сабе думаць...

У3379 Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва.
Адказны рэдактар І. [...]
Мінск, друкарня «Зв[...]